Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 10 (28609) Год LVI | Беласток, 6 сакавіка 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 5%)

МЕНШАСЦЬ СЯРОД ПРАВАСЛАЎНАЙ БОЛЬШАСЦІ?

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Сучасная школа мае жаночы твар. Гэтая асаблівасць прыкметная ўжо пры першым кантакце са школай у Кляшчэлях. Калі пераступлю парог канцылярыі, жанчыны адразу дапамогуць распрануцца, завядуць у пакой дырэктара, запросяць пачаставацца *кавай* або *гарбатай*. З ветлівай усмешкай, гасціннасцю.
— Частуйцеся *цестам*, — прыпрашае мяне спадарыня Марыся, кіраўнік канцылярыі, — гэта жонка дырэктара спякла спецыяльна пад ваш прыезд! Замест кінуцца на шакаладны пірог я наракаю на праблемы са здароўем. Штосьці нядобрае прычапілася ў дарозе. І не паспею дакончыць, як жанчыны ўжо бяруцца мяне лекаваць. Да кавы, проста з рукі ў руку, атрымаю нейкую пілюльку.

— А на што яна дапамагае? — пытаю перад тым як пераглыну парашок.

— На ўсе хваробы!

Пасля некалькіх хвілін адчуваю як наляцелы ў дарозе боль дзесьці адплывае. Як бы хто рукой адняў. Пасля, калі з урока вернецца сам дырэктар, спытаю пра палавы састаў ягоных кадраў. Ці многа ў школе настаўнікаў-мужчын? Аказваецца, прапорцыі тут, як на нашы меркі, нармальныя 4:16 (а калі ўлічыць настаўнікаў Божага закону — 7:17).

— І цяпер нашая меншасць вымушана думаць як элегантна адзначыць Свята жанчын, — прызнаецца ў сакрэце Славамір Трашчотка. — Як уганараваць нашых жанчын? Такія жэсты неабходныя для добрай атмасферы ў працы.

Будуць традыцыйныя цюльпаны, — гадаю ўголас, — шакалад, пірагі..?

— Якія пірагі? — смяецца спадар Трашчотка. — Пасля ўступнай разведкі ў школе вырашылі адсвяткаваць як заўсёды, настаўнікі проста сустрэнуцца ў мясцовым рэстаране „Карчма". Каб пабяседаваць за сяброўскім застоллем, паразмаўляць аб працы і жыцці. Вядома, у вольны ад працы час...

Апошнія мерапрыемствы, хоць адбываюцца паўсюдна ў закрытых настаўніцкіх кругах, выдатна падносяць зацікаўленне прафесіяй настаўніка. Пра іх пасля ахвотна распавядаюць па Гайнаўцы або Бельску.

* * *

У Кляшчэлі я прыехала пагаварыць пра складанасці ў навучанні беларускай мовы. Нягледзячы на прыхільную атмасферу з боку дырэкцыі (Славамір Трашчотка — настаўнік беларускай мовы), лік навучэнцаў катастрафічна скараціўся. У трэцім класе гімназіі толькі адна асоба ходзіць на ўрокі беларускай мовы. У іншых класах па 2-3, 4-5 вучняў, з-за чаго немагчыма наладзіць нармальных урокаў, а толькі міжкласныя заняткі для некалькіх груп. На 183 вучняў толькі 28 вывучае беларускую мову. Калі глядзець на рэлігійны састаў, больш за 70 працэнтаў школьнікаў складаюць праваслаўныя, з-за чаго, калі ў верасні 1996 года адкрывалі ў Кляшчэлях мадэрны дыдактычны будынак, гаварылася пра новую *беларускую школу*.

Спачатку ў школе адбываліся беларускія тэатральныя конкурсы для пачатковых школ з цэлага Падляшша. Добра памятаю той прыгожы і эмацыйны аднадзённы ўспых беларускасці. Выступленні адбываліся ў школьнай актавай зале, якая знаходзіцца адразу за парогам. Гаспадары надзвычай гасцінна прымалі ўлады БГКТ у сваіх парогах, частавалі ўсіх абедам і ветлівымі словамі. Свята ў асноўным перажывалі прыезджыя. Мясцовыя часам з'яўляліся на перапынках, каб з вышыні галерэй, што акаляюць залу, паглядзець на аднагодкаў і кінуць у іх бок некалькі каментараў. Моладзь, нават тая, якая прыйшла ў Кляшчэлі з ліквідаваных школ у Палічнай і Дашах, дзе раней гаварыла *па-свойму*, тут як зачараваная шчабятала ўжо па-польску...

Пра развіццё нацыянальнай свядомасці шмат чаго паказвае зацікаўленне падпіскай на „Ніву". Праз звычайне чытанне газеты проста ўдзельнічаем у жыцці нашай меншасці, знаёмімся з яе геаграфіяй і гісторыяй, параўноўваем сябе да іншых, будуем сваю тоеснасць. Але каб перасягнуць такі парог, неабходна вучыцца мове, дасканаліць сябе. Як памятаю, Кляшчэлі заўсёды адхіляліся ад прамацыйнай падпіскі на „Ніву", быццам іх намаўлялі да чагосьці дрэннага. У чым тады заключаецца тая неахвота і абыякавасць да беларускай мовы?

— Ці не вінаватая ў гэтым канкурэнцыя з боку мясцовых украінцаў? — пытаю ў дырэктара. — Ходзяць чуткі і паказваюць пэўныя факты, што гэтая меншасць замест змагацца з асіміляцыяй, змагаецца з беларускасцю.

— Не думаю, каб гэта была для нас канкурэнцыя. Ніхто з іх не праявіў зацікаўлення, каб навучаць у нас украінскай мове, — чую ў адказ.

* * *

Праблема абыякавасці да вывучэння беларускай мовы ў нашых асяроддзях набывае памеры эпідэміі. Яна непрыкметна і паціху забівае намаганні той жменькі інтэлігенцыі, якая на сваіх плячах нясе яе ў прышласць, часта без падтрымкі асяроддзя. Калі мы з дырэктарам хадзілі па школе і знаёміліся з яго навучэнцамі, мяне ўразіла адна сцэна. Яго выхаванцы падыходзілі да нас з нейкім сваяцкім даверам, натуральна гаварылі па-свойму, прытым адчувалася іх этнічная сувязь і добрыя адносіны паміж дарослымі і маладымі, быццам размаўлялі са сваім бацькам ці дзядзькам або цёткай. Хлопцы, зразумела, пераклікаліся жартам, сваволілі. „Зорка" для іх асацыявалася з файнай беларускай песняй. У гэтым маленькім крузе гарэў яшчэ беларускі дух, але на фоне школы ён выглядаў як беларуская нацыянальная меншасць сярод праваслаўнай польскай большасці....

У час пабыўкі ў Кляшчэлях, хоць усе тут на вуліцы гаварылі па-свойму, я ўвесь час адчувала як звужаецца наш этнічны круг. У мадэрны будынак школы на ўсю аколіцу таксама заглядае ўжо вецер. Дакладна. З-за гіганцкіх памераў яго складана ацяпліць. Па прычыне экалагічнай палітыкі рэгіёна, ацяпленне тут алейнае і на год патрабуецца 45 тысяч літраў алею. Таксама ў прасторных класах шмат вольных партаў! У вялікіх вёсках як Сухавольцы, Косьна, Жукі ці Грузка ўвогуле няма дзяцей. Самай багатай на дзяцей вёскай аказалася тут Дабрывада (адтуль давозяць 20 дзяцей), якую ў дэмаграфічным сэнсе выратавала праца на чыгунцы. Палова ўсіх навучэнцаў родам з саміх Кляшчэляў, яны таксама складаюць аснову навучэнцаў беларускай мовы.

— Я проста не ведаю, што яшчэ рабіць, — прызнаецца Славамір Трашчотка. — Заўсёды размаўляю з бацькамі першакласнікаў, каб запісалі дзяцей на ўрокі. А яны не цікавяцца гэтым. На цэлы клас падпішацца тры або пяць асоб. Як тады змагацца, ставіць амбітныя задачы? Чалавек засяроджаны адно, каб утрымаць гэтую групку да канца...

* * *

Я доўга думала як напярэдадні Дня жанчы не папсаваць сваім рэпартажам настрою ў нашых школах. Калі прыязджаю ў Кляшчэлі ці іншыя нашы школы, адчуваю вялікую сімпатыю і ветлівасць настаўнікаў і вучняў. Усе яны тэарэтычна прыхільнікі беларускай справы. Аднак не хапае таго „чагосьці", ангажаванасці. У агульным людзі надзяляюць адказнасцю за працэс навучання адно настаўнікаў беларускай мовы. Гэта недарэчнасць! Пара ўсвядоміць, што за захаванне сваёй мовы адказныя мы ўсе. А ў першую чаргу войты і бурмістры, якія абавязаны фінансаваць з лакальнага бюджэту спецыяльныя праграмы ў карысць мовы і тоеснасці. Апошняя справа павінна быць стратэгічным козырам у паспяховым развіцці гміны ці горада. Інакш нас няма.

9 770546 196000

Права жыць годна

Ідэі справядлівасці, свабоды і роўнасці неаднаразова авалодвалі розумам і душамі тых, хто ахвяраваў сабой дзеля іх здзяйснення. Але не ўсюды і не заўсёды гэтыя вялікія, і разам з тым простыя ісціны прыводзілі да жаданых вынікаў. Пакуль адны змагаліся за тыя ідэалы, рызыкуючы сабой, другія вылічвалі, якую карысць яны могуць атрымаць з перамогі першых. І выскоквалі на палітычную арэну, як чорт з кустоў, акурат у самы зручны для сябе момант. Узброіўшыся цярпеннем і разлікам прагматыкаў, якія пралічваюць і чакаюць зручнага моманту, а таксама авалодаўшы рыторыкай рамантыкаў, якія прапагандуюць найвышэйшыя ідэалы, яны адчувалі сябе непераможнымі. Размаўлялі яны правільнымі і даходлівымі для грамадства словамі, украдзенымі ў тых, хто шчыра імкнуўся змяніць свет да лепшага. Пры гэтым тыя прыстасаванцы, манячы і юродствуючы, не былі асабліва разборлівыя ў сродках знішчэння сваіх апанентаў. А змітуснёны ў штодзённых клопатах чалавек не заўсёды можа адразу адрозніць хлусню ад праўды, і нярэдка напачатку верыць лгунам.

Чалавецтва, прайшоўшы праз паслярэвалюцыйныя жахі і бясконцыя цяжкасці перыядаў перамен, заўсёды імкнулася зразумець як адрозніць тых, хто імкнецца да рэалізацыі вялікіх, хоць на той канкрэтны момант часу толькі тэарэтычных дасягненняў найвышэйшай чалавечай думкі і патрабаванняў чалавечага сэрца, ад пустаслоўя і падману карыслівых і бязлітасных прыстасаванцаў, пасля кіравання якіх і патоп здаецца толькі невялічкай непрыемнасцю. І ў розных кутках свету, у розных краінах, людзі рана ці позна пачыналі прыходзіць да адной і той жа высновы, што галоўным паказчыкам шчырасці ўсялякага кіраўніка з'яўляецца выкананне ім правоў чалавека, павага да правоў чалавека і пастанова ў цэнтр развіцця грамадства менавіта правоў чалавека. Толькі там, дзе шануюцца правы чалавека, пачынаюць дзейнічаць усе астатнія формулы гарманічнага і справядлівага развіцця грамадства.

Правы чалавека — лакмусавая паперка, якая можа стэставаць кожнага кіраўніка. Як кажуць у народзе, зрабіць праверку на вашывасць. Калі ў краіне ёсць праўна зацверджанае смяротнае пакаранне, то яно ёсць. І нікуды гэтага не схаваеш. Калі пракуратура замест кантролю над міліцыяй будуе з ёй сумесныя планы дзеянняў, а суддзі ходзяць падчас працэсу кансультавацца не з суддзямі, то гэта пошукам справядлівасці не назавеш. Гэта і з'яўляецца паказчыкам таго, як улада ставіцца да правоў чалавека.

Рыба, як сцвярджае народная мудрасць, пачынае гніць з галавы. А пасля гэтая хвароба вялага гніення разрастаецца і паступова інфіцыруе ўсё грамадства. Напачатку хварэць пачынае тое, што да галавы бліжэй. А пасля і ўсё астатняе. Людзі зняверваюцца ў ідэалах, перастаюць верыць у дабро. Проста перастаюць верыць ва ўсё. Кожны пачынае змагацца сам за сябе, а значыць супраць іншых.

Але светлы бок чалавечай натуры большасці людзей не можа з гэтым змірыцца. Людзі хочуць жыць па-чалавечы. Кожны народ хоча быць не толькі сытым, але і вечным, і годным перад вечнасцю і гісторыяй. І людзі ўсё часцей выходзяць з патрабаваннямі шанаваць іх правы. Шанаваць іх людскасць. І выкананне ўладай правоў чалавека ставяць у галоўныя патрабаванні, у прыярытэты.

Асвета прынесла ідэалы чалавечых правоў ва ўсе куткі планеты, і людзі ўсё больш разумеюць, што ад выканання ўладай менавіта правоў чалавека залежыць і ўсё астатняе. Людзі пачынаюць адстойваць свае правы, змагацца за іх, ахвяраваць за гэтыя ідэалы. І не важна ці ў арабскім, ці ў славянскім свеце — чалавек хоча жыць годна. Важна, што ён гэтага хоча.

Зараз зноў пачала рабіцца вялікая гісторыя. Наша гісторыя. Яна ўжо павярнула колы свайго вечнага гадзінніка, і час пайшоў. Людзі пачалі настойліва дамагацца выканання іх правоў. Яны маюць на тое права. Час цемрашальства і спроб вярнуцца ў багну тыраніі заканчваецца. Апошнія падзеі ў свеце таму пацвярджэнне.

Віктар САЗОНАЎ

Сілкаванне чытання

Дзе-якія інтэлектуалы наракаюць на спад чытальніцтва, на захоп грамадскай увагі электроннымі карцінкамі ды на ўсялякія іншыя грахі цяперашняй масавай культуры. Дзе-каму мо марылася б усеагульнае шчасце ў выглядзе масавага чытальніцтва кніжак ці газет, так як калісь славутаму Уладзіміру Ільічу марылася ўсеагульнае шчасце ў выглядзе масавай калектывізацыі. На вялікі жаль шчасцядаўцаў, рашучая большасць людзей ходзіць сваімі ўласнымі індывідуальнымі дарогамі — быццам каты. Гэтае апошняе заключэнне сілкую фактам, што цалкам актуальнае запрашэнне пралетарнага раней ката Лары на салоны брытанскага непралетарнага ўрада сустрэлася са станоўчым зацікаўленнем сусветнага грамадства, калі вось некалькі гадоў таму падобны ўвод маршалкавага сабакі Сабы ў наш Сейм быў адзначаны даволі кіславата.

Вяртаюся, аднак, да чытальніцтва. Ад яго, насуперак розным лямантам, немагчыма адхрысціцца. Рознамаштабныя і разнамасныя рэкламы нахабна пхаюць усе літары алфавіта ў вочы не толькі прагнай навінак моладзі, але і стомленага будаўніцтвам светлай будучыні старэйшага пакалення. А яшчэ ж у беластоцкіх аўтобусах гарадской камунікацыі электронныя пісулькі паказваюць тых аўтобусаў маршруты. Адзін такі маршрут — лініі № 16 — здзівіў мяне: у ім з'явілася вуліца Святакрыжская — заміж вуліцы Дзесяціны! Дзе Рым, дзе Крым — падумалася мне: Святакрыжская ж не там, гэта ж маленькая вулічка каля спартзалы „Влукняж". І зараз пачаў я здагадвацца, што тую вуліцу так магутна расцягнулі — аж да Генеральскай трасы. Сваю здагадку вырашыў я праверыць у Сеціве, на гарадскім партале *białystokonline.pl*. А на тым партале ўсе праекцыі Беластока, у тым ліку і *„powered by Google"*, паказвалі ўсё тое, што захавала мая старая памяць, у тым ліку і Святакрыжскую вуліцу ў вельмі сціплым маштабе. Дзе ж тады праўда: ці яна ў сусветным Сеціве з „узыходзячым" Беластокам, ці яна ў нашым тутэйшым аўтобусе? Падаўся я „шаснаццаткай" за ейнай навінкай каб пасілкавацца праўдай уласнымі вачыма.

Рэальнасць новай вуліцы Святакрыжскай далёка абагнала еўрасяжныя размахі беластоцкіх гарадскіх прамотараў. Будаўнікі вуліц зрабілі сваю работу, а вось Сеціва, *powered by Wschodzący Białystok*, гэтай работы не заўважыла. Ды к чорту са Святакрыжскай — яна крыху перыферыйная, але ж вось новай вуліцы Мазавецкай — яна ж у цэнтры горада з еўрацэнтрычнымі культурнымі памкненнямі — таксама ў Сеціве няма, а ёй жа ж больш за тры месячыкі ад здачы ў карыстанне. Мяркую, што ў нашым магістраце заселі нейкія рускія мядзведзіцы, што зіму каратаюць у абдымках магутных Марфеяў...

Новы адрэзак шырокай вуліцы Святакрыжскай не злучаны пакуль што са старым — дзеля насцілу гэтага прабела трэба яшчэ шмат работы. У гэты момант ён толькі прамавугольна сходзіцца з такім жа новым прадаўжэннем вуліцы Берлінга; там яшчэ даволі пуставата. Аднак з таго месца, быццам з лістка Мёбюса, вырысоўваецца сюррэалістычная панарама жылога квартала Дзесяціны, калі глянуўшы на яго знізу, можна пабачыць яго зверху — шэрыя хмарачосныя бетонныя шафы з полкамі і клеткамі для прагнага гарадскога жыцця „народонаселения"; паўсталі яны ў 1970-х гадах. Мне з'явілася на думку аналогія гэтых шэрых вялікамаштабных народаўмяшчальнікаў з некаторымі вялікамаштабнымі вясковымі гаспадарчымі будынкамі. Фірма „Рольмак" у Макаўцы з далучэннем Польшчы да Еўрасаюза была вымушана закрыць свае курнікі, бо клеткі ў іх былі занізкія для задаволення еўрасаюзных патрабаванняў. Цікава, калі б падобныя нормы былі для клетак з людзьмі, ці трэба было б закрываць „Другую Польшчу". Ну, але чалавек жа не еўрасаюзныя курыца ці карова, можа жыць абы-дзе, як кот Лары.

Вяртаўся я „восвояси" на аўтобусе, якога маршрут пралягаў каля старой вуліцы Святакрыжскай — яна ўжо выстраілася на вяселле з новым сваім наканаваннем, з новым адрэзкам. З-за новых жылых блокаў побач яе сумна выглядала яшчэ больш шэранькая, чым блокі на Дзесяцінах, спартзала „Влукняж". У той жа дзень беластоцкія медыі паведамілі пра недалёкі яе знос; гэта не ад еўрасаюзных патрабаванняў. Калісь будавалі яе з разлікам на баскетбалістак, *powered by* мясцовыя тэкстыльныя заводы. Тэкстыльныя заводы выраслі ва Узыходзячым Кітаі, а насельніцтва Узыходзячага Беластока пра баскетбалістак можа цяпер адно... пачытаць; магчыма — на парталах *powered by* адлеглыя ад „узыходзячага" Беластока суб'екты.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Сеймавая рэзалюцыя

Ва ўрачыстай форме, значыць, воплескамі і стаяўшы ды аднагалосна Сейм прыняў рэзалюцыю, якая заклікае ўрад РП да дзеянняў у адносінах да прымянення палітычных рэпрэсій у Рэспубліцы Беларусь. Галасаванне ў Сейме адбылося з удзелам прадстаўнікоў беларускай апазіцыі, між іншым старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі XII склікання Станіслава Шушкевіча і аднаго з кандыдатаў на прэзідэнта ў апошніх выбарах Аляксандра Мілінкевіча. Станіслаў Шушкевіч выказаўся м.інш. за падтрымку Польшчай беларускага адкрытага грамадства, між іншым, за функцыянаванне праграмы імя Каліноўскага, Радыё Рацыя і тэлебачання БелСат.

Дзень да галасавання дэпутаты правялі кароткую дэбату датычную рэзалюцыі.

— Гэта не толькі наш голас салідарнасці, але і голас у абарону праследаваных, — гаварыў падляшскі дэпутат ад ГП, віцэ-старшыня сеймавай камісіі замежных спраў Роберт Тышкевіч. — Маўчанне ўспрымаецца рэжымамі як адабрэнне палітыкі праследу.

Дэпутат Адам Ліпінскі з ПіС пры нагодзе выказаў меркаванне аб палітыцы польскіх улад у адносінах да Беларусі:

— Я лічу, што адпаведнай альтэрнатывай з'яўляецца палітыка закончаных фактаў або палітыка ілюзорнага дыялогу. І наколькі ПіС быў прыхільнікам закончаных фактаў, дык цяперашняя каманда была — была, бо маю надзею, што гэта зменіцца — прыхільніцай ілюзорнага дыялогу.

І дадаў:

— З дыктатарамі ніхто не дагаворыцца.

Тадэвуш Івінскі ад СЛД:

— (...) Трэба быць асцярожнымі пры задумах прымяняння эканамічных санкцый, бо яны заўсёды адбіваюцца на звычайных грамадзянах, а адначасова патрэбны спецыяльны механізм падтрымкі беларускіх няўрадавых арганізацый, незалежных СМІ, такіх як Еўрапейскае Радыё для Беларусі, як Радыё Рацыя, БелСат.

Францішак Стэфанюк з ПСЛ меў іншую думку чым, напрыклад, Адам Ліпінскі:

— Я мяркую, што форма дыялогу павінна захоўвацца і працягвацца, але павінна быць адпаведная форма выказваных слоў, якія пераконваюць, а не абражваюць.

Палітыку дыялогу палічыў добрай таксама Марэк Бароўскі з клуба Польская сацыял-дэмакратыя. На думку Збігнева Вайцяхоўскага з клуба Польшча ёсць найважнейшай, цяпер самым важным заданнем з'яўляецца скласці — як гэта назваў — спісак катаў адказных за рэпрэсіі:

— Верым, што наступіць такі час, калі гэтыя злачынцы будуць асуджаны Трыбуналам у Страсбургу, а ў будучыні можа і ў самой дэмакратычнай Беларусі.

Яраслаў Пента ад ГП выказаўся за пашырэнне спіска асоб непажаданых у Польшчы (ёсць ужо такі спісак, які датычыць уезду на тэрыторыю Еўрасаюза 157 асоб; па-за тымі асобамі ў Польшчы рашэнні аб уездзе разглядаюцца індывідуальна) м.інш. на сем'і гэтых асоб ды міліцыянтаў, вайскоўцаў і іншых членаў рэпрэсіўнага апарату. Падляшскі дэпутат ад СЛД Яўген Чыувін затое сказаў:

— (...) Яшчэ нядаўна прэм'ер Берлюсконі цалаваў Кадафі ў руку, а Салана выходзіў яму насустрач, калі той прыехаў у Брусель. Святой памяці прэзідэнт Лех Качынскі, здаецца, узнагародзіў Мубарака найвышэйшым Ордэнам Белага Арла [наколькі ведаю, гэты ордэн атрымаў ад Леха Качынскага кароль Саўдаўскай Аравіі Абдула, а не Госні Мубарак — М. Х.] і г.д. Так яно ёсць з дыктатарамі, што калі яны на нашым баку, можам іх нават у руку пацалаваць, а калі не — дык не.

На здзіўленне некаторых назіральнікаў дэбаты віцэ-міністр замежных спраў Кшыштаф Станоўскі падтакнуў дэпутату Чыквіну:

— Параўнанне да сітуацыі ў Паўночнай Афрыцы — трапнае.

А мне, аднак, здаецца, што параўнанне рэжыму ў Беларусі з рэжымамі Паўночнай Афрыкі — сама менш абсурднае. Пра гэта, аднак, пагаворым пры іншай нагодзе.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

XII ГАЙНАЎСКАЯ ГАВЭНДА

Хаця арганізатараў і ўдзельнікаў XII Конкурсу беларускай гавэнды, які 25 лютага адбыўся ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, здзівіла меншая чым заўсёды колькасць расказчыкаў з гімназій і невялікая колькасць вучняў падставовых школ, то ўзровень лепшых сёлетніх расказаў быў высокі ва ўсіх узроставых катэгорыях. Мерапрыемства ўдастоілі гайнаўскі бурмістр Ежы Сірак, дырэктар Культурнага цэнтра Беларусі пры Пасольстве РБ у РП Аляксандр Карачун і яго намеснік Дзяніс Вялічка. За ходам конкурсу наглядалі ініцыятар і галоўны арганізатар „Гавэнды", настаўнік беларускай мовы Ян Карчэўскі і асабіста дырэктар белліцэя Яўген Сачко. Афіцыйныя госці і белліцэісты, якія састаўлялі публіку, часта смяяліся ў час выступленняў удзельнікаў конкурсу і не шкадавалі ім апладысментаў. Члены конкурснай камісіі спачатку стрымліваліся ад смеху, а пасля і самі смяяліся разам з публікай.



Дамініка Пуц з Падставовай школы № 3 у Гайнаўцы заняла першае месца ў катэгорыі вучняў падставовых школ

Разнародныя выступленні

Аднак расказванне смешнага гэта яшчэ не тое самае, што выступленне на высокім узроўні і перамога. Хаця расказаў, якія выклікалі смех, было многа, то галоўнымі пераможцамі сталі адзінкі. Вялікіх тэатральных здольнасцей і вялікай асабістай ангажаванасці патрабуе займальнае расказванне пра настальгічнае і сумнае і можа таму такіх расказаў у час „Гавэнды" было мала. Аднак, як апекуны расказчыкаў, так і старэйшыя вучні былі згодны, што ўзровень сёлетніх аповедаў у агульным быў на высокім узроўні.

— Частка расказаў падабраных на конкурс была вельмі цікавай, датычыла жыцця вучняў або дарослых асоб, — сказала член конкурснай камісіі, бібліятэкарка Ірэна Ігнатовіч.

— Важнай справай з'яўляецца правільны падбор расказаў канкрэтным вучням, культура слова, жэсты і ўмеласць пераказаць публіцы тое, што ў расказах найважнейшае, — заявіла старшыня конкурснай камісіі, метадыст па навучанні беларускай мовы Іаланта Грыгарук. — Не ўсе расказы былі правільна падабраны да тэмпераменту і здольнасцей вучняў, а і не заўсёды ёсць магчымасці, каб знайсці здольных вучняў, якія маглі б умела выступіць з расказамі.

— Каб гімназісты ўдала выступілі, трэба супольна з вучнямі падрыхтаваць цікавыя расказы, дапасаваныя да тэмпераменту школьнікаў. Вучням складана выступаць перад вялікай публікай і таму сюды прыязджаюць нашы найлепшыя вучні з мастацкімі здольнасцямі, якія не баяцца сцэны, — гаварыла настаўніца беларускай мовы са школы ў Чыжах Вера Флёрчук. — Конкурс расказчыкаў — добрая нагода для сустрэч і знаёмства паміж вучнямі. Расказчыкі маюць магчымасць адкрыта і шчыра запрэзентаваць свае ўмеласці перад публікай.

— Я прывезла ўсіх ахвотных выступіць у час „Гавэнды". Нашы вучні вельмі сур'ёзна ставяцца да конкурсу. Мы падбіраем тэксты да расказаў супольна з вучнямі. Аднак Караль Лукша сам знайшоў расказ, а Уля Беразавец рыхтуе расказ па-свойму са спадарыняй Аліцыяй Станько, былой бібліятэкаркай з Ласінкі. Добра, што можна выступаць на літаратурнай мове і на гаворцы, бо апошні варыянт дае вялікія магчымасці тым вучням, што хочуць больш расказваць ад сябе, — сказала настаўніца з Нарвы Ніна Абрамюк.

— Мы любім нашу беларускую мову і ахвотна выступаем перад публікай. Падрыхтавалі такі расказ, каб рассмяшыць тут сабраных, — заявілі белліцэісткі Малгажата Іванюк і Барбара Нядзельская, якія ўжо другі раз змагаліся за першынство ў час конкурсу расказчыкаў.

Хлопцы з Гімназіі ў Нараўцы таксама чарговы раз прыехалі са сваімі смешнымі расказамі.

— Я ўжо чацвёрты раз на „Гавэндзе" і сюды ў галоўным прыцягвае мяне прага спаборніцтва з іншымі, — сказаў Павел Засім са школы ў Нараўцы, які амаль штогод становіцца адным з галоўных пераможцаў.

Раўнапраўныя першыя месцы сярод гімназістаў занялі Наталля Семянюк са школы ў Чыжах і Павел Засім з Нараўчанскай гімназіі

— Я люблю расказваць па-беларуску, а да конкурсу рыхтаваўся два тыдні. У час падрыхтоўкі многа залежыць ад складанасці расказаў і ад нашай ахвоты да рэпетыцый, — сказаў Лукаш Марчук, гімназіст з Нараўкі. — Тут нам цікава паслухаць расказаў іншых, якіх мы бачылі на папярэдніх конкурсах. У гэтым годзе асабліва спадабаліся нам расказы белліцэістак.

— Пані прапанавала нам тэмы да расказаў, а мы выбіралі тыя, што нам падыходзілі. „Гавэнда" — файны конкурс, бо можна дабаўляць новае да расказаў, нават у час самога конкурсу. Я напрыклад „намяшаў" у палове расказу, але стараўся дабаўляць ад сябе і клеіць усё, каб расказ быў складным. Калі б мы вельмі добра гаварылі па-свойму, тады яшчэ больш можна было б дабаўляць тут, на месцы, — заявіў Павел Засім, які стаў адным з двух галоўных пераможцаў з ліку гімназістаў.

Вучаніцы са школ у Чыжах і Нарве, што расказвалі па-свойму, занялі ў сваёй катэгорыі першае і другое месцы.

— Нашы вучні многа трэніраваліся і складна расказвалі перад сваімі сябрамі. А тут ахапіла іх хваляванне і зусім інакш атрымалася, чым у час рэпетыцый, — сказала настаўніца са школы ў Нараўцы Анна Кандрацюк.

Вярнуцца да больш масавага мерапрыемства

— Здзіўляе нас, што сёлета ў час „Гавэнды" выступае мала ўдзельнікаў. Былі гады, калі Ян Карчэўскі прасіў праводзіць школьныя адборы і абмяжоўваць колькасць вучняў, якіх мы прывозілі, — сказала настаўніца Вера Флёрчук.

— Нашы вучні рады, што бяруць удзел у „Гавэндзе". Сёлета высокі ўзровень выступаў, але шкада, што такое малое спаборніцтва сярод вучняў падставовых школ, — заявіла настаўніца Падставовай школы № 3 у Гайнаўцы Марыя Крук.

У катэгорыі вучняў падставовых школ выступілі пяцёра школьнікаў — 3 асобы з ПШ № 3 у Гайнаўцы і 2 дзеткі з ПШ у Нарве, а ад вучняў звышгімназічных школ з двума расказамі выступілі тры гайнаўскія белліцэісткі. У катэгорыі вучняў гімназічных школ змагаліся гімназісты з Нарвы, Нараўкі, Чыжоў і Дубін, разам 10 асоб.

— Мы ведаем, што Ян Карчэўскі засмучаны меншай колькасцю ўдзельнікаў, але ж цяпер нічога мы ўжо не зробім. У гэтым годзе атрымалася накапленне вялікай колькасці конкурсаў і можа конкурс трэба ладзіць восенню, перад Філіпавым постам, — разважала настаўніца беларускай мовы з Дубін Ніна Куптэль.

— Мне цяжка растлумачыць прычыну меншай колькасці сёлетніх удзельнікаў, у параўнанні да мінулых гадоў, — гаварыў галоўны арганізатар Ян Карчэўскі. — Сам конкурс расказчыкаў здабыў ужо прызнанне і я заўважыў, што ажно больш за 1100 асоб заглянула на сайт з інфармацыяй пра сёлетні наш конкурс, на рэкламны сайт **www.afisza.org.** Многа ў гэтым плане залежыць ад настаўнікаў беларускай мовы і я планую ў верасні паразмаўляць з імі ў справе нашага конкурсу, бо ў гэтым годзе не было заўваг ад настаўнікаў, а ўдзельнікаў прыбыло менш, чым раней. Я разлічваю, што мы пражылі кароткі крызіс, але конкурс будзе арганізавацца надалей і карыстацца большым зацікаўленнем, чым сёлета.

— Я думаю, што толькі ў гэтым годзе паменшала колькасць удзельнікаў, бо накапілася ў адзін час многа конкурсаў — „Роднае слова", Конкурс расійскай паэзіі і прадметныя конкурсы. У наступным годзе можа ізноў быць замнога ахвотных да расказаў, — гаварыла настаўніца з Нараўкі Анна Кандрацюк. — Справа не ў колькасці, але ў якасці. Мы маглі б прывезці вучняў з падставовай школы, якія вывучылі б на памяць загадзя падрыхтаваныя расказы, але без мастацкіх здольнасцей іх расказы не атрымаліся б цікавымі, маглі б быць без душы.

Мае суразмоўцы хвалілі „Гавэнду", між іншым, за тое, што яна інтэгруе беларускую моладзь.

— „Гавэнда" гэта файны конкурс. Тут мы атрымліваем цікавыя ўзнагароды і добра расказваецца, — гаварыла Мартына Панасюк з гайнаўскай „тройкі".

— Мы любім расказваць і штогод з „Гавэнды" вяртаемся з нейкімі падарункамі, — дабавіла ейная сяброўка Дамініка Пуц.

Фундатарамі падарункаў, якія атрымалі пераможцы, і кніжак, якія ўручалі кожнаму ўдзельніку конкурсу, былі Беларускі музей з Гайнаўкі, Гайнаўскае староства, Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве РБ у РП, Гайнаўская гарадская ўправа і Бацькоўскі камітэт пры Гайнаўскім белліцэі.

Конкурсная камісія ў катэгорыі вучняў падставовых школ першае месца прызначыла Дамініцы Пуц, другое месца — Матэвушу Грыгаровічу, трэцяе — Мартыне Панасюк (усе 3 асобы з ПШ № 3 у Гайнаўцы) і Агаце Беразавец з ПШ у Нарве. Сярод вучняў гімназій першыя месцы занялі Павел Засім з Нараўкі і Наталля Семянюк з Чыжоў. Другое месца занялі Лукаш Марчук з Нараўкі, Уля Беразавец з Нарвы і Тамаш Леановіч з Дубін, а на трэцім месцы апынуліся Караль Лукша і Дамініка Юшкевіч з Нарвы і Адам Харкевіч з Нараўкі. З ліку гайнаўскіх белліцэістак першае месца занялі супольна выступаючыя Малгажата Іванюк і Барбара Нядзельская, а другое месца заняла Кацярына Грыгарук.

Іканастас чакае аднаўлення

Іканастас царквы св. Мікалая Цудатворца ў Белавежы з'яўляецца адзіным такім помнікам старадаўнасці ў Польшчы. Ён выкананы з кітайскага фарфору напрыканцы XIX стагоддзя. У верасні 1939 года іканастас і ўвесь храм пашкодзілі бомбы, якія скінула на мясцовасць падчыненая Герынгу Люфтвафэ. Вернікі ў 1943 годзе адбудавалі царкву, а знішчаны ў 50 працэнтах іканастас аднавіў мясцовы ўмелец Купрыян Лісіцкі. Ад таго часу мінула амаль 70 гадоў і іканатас патрабуе ўжо рэстаўрацыі. Настаяцель прыхода а. Сяргей Корх ад некалькіх гадоў шукае для гэтага сродкаў, а патрэбны каля 700 тысяч злотых. На жаль, чарговы раз адкінулі яго праект дафінансавання рэстаўрацыі ў конкурсе Рэгіянальнай аперацыйнай праграмы Падляшскага ваяводства. Белавежскі праект, хаця атрымаў пазітыўную рэкамендацыю, не здолеў накапіць адпаведнай колькасці пунктаў. Дык айцец Сяргей не здаецца, будзе цяпер намагацца здабыць еўрасаюзныя грошы з гэтак званых нарвежскіх сродкаў. Ведаючы клапатлівасць настаяцеля, мы ўпэўнены, што яму ўрэшце пашанцуе.

Пётр БАЙКО

Чаромхаўская статыстыка

Чаромхаўская гміна займае плошчу 9 673 гектары. У дванаццаці салэцтвах пражывае 3 607 жыхароў. Стан такі зафіксаваны на 23 снежня 2010 года. У мінулым годзе, нарадзілася 22 дзетак, памерла 65 чалавек. Прапорцыя народзін да смяротнасці складае 1:3. Гэты трывожны паказчык паўтараецца ў Чаромсе з году ў год. Трыццаць год таму, напрыклад, у гміне пражывала 4900 чалавек. У 1997-1998 гадах лік насельніцтва знізіўся да 4 300; тады зарэгістравана 29 шлюбных пар, нарадзілася 70 дзетак, а ў вечны спачын адышло 112 чалавек. У наступных гадах паказчыкі таксама не былі аптымістычныя. У 2000 г. насельніцтва налічвала 4118 чалавек, нарадзілася 34, памерла 43. Пяць год пазней, у 2005 годзе, лік насельніцтва скдадаў 3 932 чалавек, нарадзілася 30, памерла 58. Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе. Грамадскасць старэецца. Менш народзінаў, чым пахаванняў. На дэмаграфічную дэпрэсію не паўплывала нават „бэціковае". Зараз кіруючая кааліцыя задумваецца ці не адмяніць яго, дзеля залатання дзіркі ў бюджэце. Чаромхаўскія радныя задумваюцца над мэтазгоднасцю рэалізацыі планавай інвестыцыі — пабудовы новага дзіцячага садка, зважыўшы на невялікую колькасць дзетак.

Загінуў зубр

17 лютага вечарам на трасе Лясная — Семяноўка Нараўчанскай гміны проста пад кола над'язджаючага аўтамабіля выбег зубр. Шафёр не паспеў затармазіць і звярына загінула на месцы. На шчасце жыхар Гайнаўкі не пацярпеў у аварыі. Звярынай заняліся працаўнікі Белавежскага нацыянальнага парку. Гэта чарговае на Гайнаўшчыне сутыкненне звярыны з аўтамабілем. Выпадкі здараюцца перш за ўсё на скрыжаваннях дарог, калі звярына падаецца за кормам. Шафёры на лясных трасах павінны захаваць асцярожнасць.

Уладзімір СІДАРУК

Размова з войтам Дубіцкай гміны Лявонам Малашэўскім

Новыя планы войта Дубіч–Царкоўных

— Ваш папярэднік Анатоль Паўлоўскі ўзначальваў Дубіцкую гміну амаль 30 гадоў. Як жыхары гміны ўспрынялі новаабранага войта?

— Я — ураджэнец Дубіцкай гміны, а канкрэтна Старога Корніна. Працую ў гміннай управе ў Дубічах з 1983 года, а апошнім часам узначальваў аддзяленне, якое займаецца ў галоўным камунальнай гаспадаркай і землевыкарыстаннем. Людзі ў нашай гміне ведаюць мяне і ведалі за каго галасаваць. Я думаю, што добра ўспрынялі мяне на пасадзе войта тыя, што галасавалі за мяне. А тыя, што галасавалі за маіх контркандыдатаў, можа і не задаволеныя, але такія ўжо прынцыпы дэмакратыі.

— Што зрабілі Вы ў першую чаргу, калі сталі войтам? Якія планы на бліжайшую будучыню?

— У першую чаргу рэалізуем інвестыцыі, якія былі падрыхтаваны папярэднім войтам. Зараз адбываецца рэкультывацыя вадасховішча „Бахматы" каля Дубіч. Гэтая інвестыцыя зрэалізаваная прыблізна ў 80%. Удалося нам закончыць рамонт святліцы ў Грабаўцы і забяспечыць яе патрэбным абсталяваннем. У бліжэйшым часе хочам распачаць рамонт асяродка здароўя ў Дубічах-Царкоўных. Атрымалі мы ўжо сродкі на выкананне 64 прысядзібных раслінна-гравійных ачышчальняў сцёкаў у прыпушчанскіх вёсках і на хутарах вёскі Ягаднікі. Вясной пачнем іх будову.

— Ваша гміна лічыцца адной з найбяднейшых у павеце і ваяводстве. Якія ў Вас планы па прыцягненню пазабюджэтных сродкаў для інвестыцый?

— Будзем выступаць за еўрасаюзныя сродкі. У рамках Праграмы развіцця вясковых тэрыторый мы атрымлівалі і маем магчымасць атрымаць 75% дафінансавання коштаў інвестыцый, але на практыцы адлічаюць нам ад гэтага падатак ПДВ у якасці некваліфікаваных коштаў і тады дафінансаванне атрымліваецца ў памеры каля 60% коштаў інвестыцый (хаця не заўсёды гэта адбываецца — А. М.). Сваёй „нормы" — 4 мільёны злотых на гміну (у 2007-2013 гг. — А. М.) — мы яшчэ не выкарысталі і зараз рэалізуем інвестыцыі ў рамках гэтай праграмы. Паявілася таксама магчымасць атрымаць льготныя крэдыты на ўласны ўклад у інвестыцыі ў рамках заахвочвання міністрам асяроддзя прыпушчанскіх самаўрадаў да аднаўлення размоў у справе пашырэння Белавежскага нацыянальнага парку. Выканалі мы ўжо дакументацыю на будову каналізацыі ў Грабаўцы, прызначаны ўжо нам сродкі на будову каналізацыі ў Ягадніках. Астатнюю інвестыцыю намерваемся зрэалізаваць у 2012 годзе. Рыхтуемся таксама да апрацоўкі дакументацыі на каналізацыю ў Старым Корніне, Карыцісках, Тафілаўцах і Чахах-Арлянскіх. Распачалі мы ўжо рамонт святліцы ў Карыцісках. Прадбачваем рамантаваць святліцу ў Старым Корніне, а пасля ў Тафілаўцах, Істоку, Вітаве, Войнаўцы і Елянцы. Аднак жыхары нашай гміны ў першую чаргу патрабуюць рамантаваць дарогі. У нас апрацаваная ўжо дакументацыя на мадэрнізацыю дарогі Грабавец — Дубічы-Царкоўныя, але грошай на яе дафінансаванне не атрымалі. Будзем паўторна выступаць за дафінансаванне гэтай дарожнай інвестыцыі. Разам з Гайнаўскім стараствам хочам заасфальтаваць вуліцу ў Рудцы, плануем асфальтаваць дарогу ў Вэрстоку і тады застанецца нам да асфальтавання толькі вуліца ў Гурным Грудзе, бо ўсе іншыя вуліцы ў нашай гміне ўжо заасфальтаваныя. Хочам таксама заасфальтаваць кавалак дарогі з Ягаднік да хутара, распаложанага ў напрамку Дубіч-Асочных.

— У красавіку-чэрвені адбудзецца агульны перапіс насельніцтва. Ці перапісчыкі ў Вашай гміне падрыхтаваныя ўжо да правядзення перапісу, асабліва ў справах пытанняў пра нацыянальнасць і мову?

— Зараз адбываюцца курсы перапісчыкаў. Яны ў нас — мясцовыя людзі, свядомыя асаблівасці і важнасці гэтых пытанняў. Я думаю, што будуць яны бачыць розніцу паміж грамадзянствам і нацыянальнасцю. Названне сваёй нацыянальнасці важнае, бо ад гэтага будзе пасля залежаць дафінансаванне дзейнасці нацыянальнай меншасці.

— У час апошняга перапісу насельніцтва ў 2002 годзе больш за 80% жыхароў Вашай гміны назвалі сябе беларусамі. Якія ў Вас планы па падтрымцы і прамоцыі беларускай культуры ў гміне?

— Гледзячы збоку, я ўжо раней заўважыў, што выдатная большасць жыхароў нашай гміны назвала сябе ў час перапісу беларусамі, а ў нас ладзіцца вялікае ўкраінскае мерапрыемства „Ноч Купалы". Я думаю, што трэба ў большай ступені папулярызаваць у нашай гміне беларускую культуру, перш за ўсё ў час масавых мерапрыемстваў. У мінулым годзе мы з Беларускім музеем у Гайнаўцы наладзілі тры беларускія фэсты ў гміне і маю надзею, што так будзе і сёлета. Аднак мне хацелася б, каб у нашай гміне арганізаваць вялікае беларускае мерапрыемства побач вадасховішча „Бахматы" або на вялікай плошчы перад „Гасцінным домам" у Дубічах, уласнікам якога з'яўляецца суполка „Пронар" з Нарвы. Будзем рамантаваць святліцы і ў час іх адкрывання таксама можна будзе наладзіць канцэрты беларускіх калектываў. У нашай гміне пачало дзейнічаць Аб'яднанне развіцця Дубіцкай зямлі „Бахматы" ў Грабаўцы. Ствараюцца магчымасці весці намаганні не толькі ў напрамку паляпшэння матэрыяльнага ўзроўню жыцця насельніцтва, але таксама знаёміць нашых людзей з духоўнымі каштоўнасцямі.

— У суседняй Арлянскай гміне яшчэ ў гэтым годзе з'явяцца ўказальнікі мясцовасцей на польскай і беларускай мовах. Ці бачыце патрэбу ўвядзення ў Вашай гміне дапаможнай беларускай мовы, а пасля ўстанаўлення двухмоўных указальнікаў?

— Я за тым, каб паспрабаваць зрабіць такое і ў нашай гміне. У гміннай управе ў кантактах з наведвальнікамі мы часта карыстаемся сваёй мовай. Турысты з глыбі Польшчы казалі, што ахвотна бачылі б двухмоўныя ўказальнікі на нашай тэрыторыі. У час сустрэч з жыхарамі паспрабую спытаць іх, як яны бачаць ідэю двухмоўнасці. Двухмоўныя ўказальнікі давалі б магчымасць захаваць даўнія назвы нашых мясцовасцей і былі б турыстычным атракцыёнам. Пабачым яшчэ таксама як двухмоўныя ўказальнікі будуць успрыняты ў Арлянскай гміне. Я не хацеў бы зверху навязваць нашым жыхарам двухмоўных указальнікаў.

— Апошнім часам санітарныя службы забаранялі купацца ў вадасховішчы „Бахматы". Ці пасля абнаўлення вадаёма можна будзе разлічваць на большы прыток турыстаў і прыбытак ад турыстычнай дзейнасці ля вадасховішча, які трапляў бы ў гмінны бюджэт?

— Гміннай уласнасцю з'яўляюцца начлежныя домікі побач вадасховішча. Даход з найму 30 начлежных месц і аказвання паслуг ля вадасховішча вельмі малы, амаль нулявы. Але важнае тое, што турыстаў абслугоўвае 6 асоб, якія такім чынам маюць працу.

— А як у гміне развіваецца агратурызм?

— Ёсць у нас агратурыстычныя кватэры, якія заняты перш за ўсё летам. Цяпер жывуць у іх работнікі, што будуюць фабрыку „Ікеі" ў Арлянскай гміне. Агратурызм у нашай гміне гэта дадатковы бізнес і заробак уласнікам агратурыстычных кватэр. Апошнім часам паявілася таксама ідэя будовы прыватнага пансіёна ў Войнаўцы.

— А якія ў Вашай гміне планы па стварэнню новых месц працы ў прамысловай дзейнасці?

— На палях Сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва ў Старым Корніне ідзе падрыхтоўка да будовы біягазавага завода, які прадукаваў бы электраэнергію. Створацца новыя месцы працы, хаця не будзе іх многа. Вонкавая суполка, якая хоча інвеставаць у нашай гміне, для вытворчасці электраэнергіі плануе прымяніць зялёную масу з палёў корнінскага сельгаскааператыва і сельскіх гаспадарак. Магчыма, што і адходы з біягазавага завода будуць выкарыстаны ў нас у якасці ўгнаення. З іншай ініцыятывай выступілі нашы хлопцы, якія ў былым школьным будынку ў Чахах-Арлянскіх хочуць заснаваць прадпрыемства па вытворчасці вяндліны на ўсходні рынак. Інвестараў у прамысловую прадукцыю перш за ўсё знеахвочвае строгая ахова прыроды ў рамках праграмы „Натура-2000", а тэрыторыі ахопленай гэтай праграмай у нас многа.

— Дзякую за размову і жадаю поспехаў у працы на пасадзе войта Дубіцкай гміны. **Гутарыў Аляксей МАРОЗ**

Якуб ЛОГІНАЎ

Не толькі Еўрасаюз прымяняе візавыя санкцыі

Пасля падзей з 19 снежня краіны ЕС зноў адкрылі пытанне візавых санкцый для беларускіх палітыкаў і чыноўнікаў. Гаворка ідзе таксама аб магчымым спыненні ўдзелу Беларусі ў праграмах „Усходняга партнёрства". Аднак польскія палітыкі і журналісты забываюць аб тым, што санкцыі ў адносінах Беларусі і Польшчы/ЕС — гэта зброя, якую выкарыстоўваюць абодва бакі канфлікту. Гэта значыць, што не толькі ЕС забараняе ўезд некаторых беларускіх грамадзян у краіны Шэнгенскай зоны, але таксама Рэспубліка Беларусь упісвае новыя і новыя асобы ў свой „чорны спіс". І хоць для радавога паляка гэта можа здацца смешным, але для многіх асоб, уключаючы аўтара гэтых радкоў, забарона ўезду ў Беларусь з'яўляецца не менш едкай, чым забарона ўезду ў ЕС для грамадзян Беларусі.

Трапіць на беларускі „чорны спіс" вельмі лёгка. Ведаю дзяўчыну, якой забаранілі ўезд у Беларусь толькі таму, што яна арганізавала на сваім універсітэце ў Варшаве студэнцкую канферэнцыю на тэму стану беларускай мовы ў РБ. Без прамых палітычных дэманстрацый, вось проста закранулі тэму мовы і незалежнай беларускай культуры, што не спадабалася адпаведным людзям у КДБ.

Іншыя не могуць уехаць у Беларусь з-за таго, што падчас мытнага кантролю ў іх заплечніку знайшлі майку з Пагоняй, кампакт-дыскі з музыкай „Н.Р.М." ці асобнікі незалежнай, хоць усё ж легальнай беларускамоўнай прэсы. Прычын забароны ўезду можа быць шмат і неабавязкова гэта павінна мець прамую сувязь з палітыкай.

Колькі польскіх грамадзян мае забарону ўезду ў Беларусь — таго не ведаюць нават самі беларускія органы. Як правіла, дадзеная асоба ніколі афіцыйна не даведаецца, што яе прызналі персонай нон грата. Проста ўсе спробы адкрыць беларускую візу канчаюцца адмовай, а на пытанне, што з'яўляецца яе прычынай, працаўнік консульства адмаўляецца адказаць. Прытым не выдаюць ніякага матэрыяльнага пацвярджэння, ні штампу ў пашпарце. Справы няма, а значыць і нельга ад гэтай адмовы даваць апеляцыю.

Асоба, якой адмовілі ў візе, да канца не ведае, ці гэта аднаразова, ці проста ёй далі забарону ўезду. А калі так, то на як доўга — на год, два, на ўсё жыццё? Дарэчы, як мне ўдалося высветліць у беларускім пасольстве ў Кіеве, сам консул, нават калі б хацеў дапамагчы, нічога не можа тут зрабіць. У камп'ютары ёсць толькі інфармацыя, што нельга выдаць візу і ў большасці выпадкаў там не напісана ніякіх дэталяў. Выдаць пасведчанне аб тым, што дадзеная асоба мае забарону ўезду, консул таксама не можа — яму гэта забаронена, за такое ён бы адразу вылецеў з працы.

Што можа зрабіць чалавек, які трапіў у такі чорны спіс і лічыць гэтае рашэнне неабгрунтаваным? На сваім прыкладзе магу сказаць адно: куды не звернешся — ніхто не дапаможа. Думаю, чытачам „Нівы" будзе цікава прачытаць пра мае спробы растлумачыць сітуацыю сваёй забароны ўезду, падчас якіх я адчуваў сябе нібы галоўны персанаж „Працэсу" Кафкі.

У беларускім консульстве ў Гданьску, дзе мне ўпершыню адмовілі ў візе, неафіцыйна параілі мне звярнуцца ў польскае пасольства ў Мінску і папрасіць дыпламатаў, каб заступіліся за свайго грамадзяніна. Я гэта і зрабіў, напісаў у пасольства заяву, у якой апісаў сваю сітуацыю і папрасіў дапамагчы. Як я адзначыў, я цалкам прызнаю суверэннае права Рэспублікі Беларусь забараніць мне ўезд у гэтую краіну, але я мяркую, што маю права на тое, каб пра такое рашэнне і яго прычыны мне афіцыйна паведамілі.

Адказ ад польскага пасольства я атрымаў пасля нейкіх двух месяцаў, хоць па законе аб адміністрацыйным праве гэта павінна быць да двух тыдняў. Карацейшы адказ цяжка сабе ўявіць. „Амбасада Рэспублікі Польшча ў Мінску пацвярджае прыняцце вашай заявы і інфармуе, што звярнулася ў Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь з просьбай растлумачыць гэтую сітуацыю. Аб выніках Вам паведамім". Аднак не паведамілі — відаць, нікому не залежала на вырашэнні гэтага пытання, а мая заява трапіла кудысьці глыбока ў бюракратычную машыну, і ўсе пра яе забыліся.

Спробы мэйлавага і тэлефоннага кантакту з пасольствам не прынеслі ніякага выніку. На э-мэйл ніхто не адказваў, датэлефанавацца было амаль немагчыма. А калі нарэшце хтосьці падымаў трубку, то аб справе нічога не ведаў, прасіў патэлефанаваць заўтра і гэтак далей. Пасля месяца такіх спроб я зразумеў, што гэта нічога не дасць і даў сабе супакой.

Час ад часу наведваў я Гданьскае консульства і пытаўся, ці нешта ў маёй справе змянілася. Аб гданьскім і беластоцкім консульствах я нічога дрэннага сказаць не магу, яны мяне ветліва прымалі, аднак ніякіх станоўчых вестак не было. „Трэба чакаць" — даведваўся я кожны раз.

Потым мне параілі адправіць ліст у Міністэрства замежных спраў у Мінск. Прычым ліст-заяву адправіў не я, але мой працадаўца (я працаваў тады ў порце Эльбланг і каардынаваў польска-беларускі праект). Заява засталася без адказу, хоць у маёй справе ўмяшаўся адзін дэпутат польскага Сейма і некалькі іншых афіцыйных асоб, якія правялі пэўныя размовы на дастаткова высокім узроўні, прычым далёка не ўсе дэталі гэтых сустрэч мне знаёмыя.

Між тым я яшчэ звяртаўся ў польскае МЗС і апеляваў аб тым, каб міністэрства афіцыйна заступілася за сваіх грамадзян, якім забараняюць уезд у Беларусь. Магчымасць гэта зрабіць была ў 2007-2008 гадах, калі вяліся польска-беларускія перамовы і дэбаты на ўзроўні ЕС наконт часовай адмены санкцый для беларускіх палітыкаў і чыноўнікаў. На мой погляд, тады лагічна было прымяніць прынцып узаемнасці: мы (Польшча, ЕС) дазволім уезд на тэрыторыю Еўрасаюза вашым чыноўнікам, але вы павінны зрабіць аналагічны крок і дазволіць уезд у Беларусь польскім грамадзянам, якія трапілі ў чорны спіс. Польскае МЗС гэтае пытанне цалкам праігнаравала — для палітыкаў і дыпламатаў у Варшаве, але таксама для польскіх журналістаў, праблема візавых санкцый з боку Беларусі не існуе.

Часта сустракаюся з пытаннем: а чаму табе так залежыць, каб паехаць у Беларусь? Людзям цяжка зразумець, што для нас, палякаў з забаронай уезду ў Беларусь, гэта сапраўды цяжкая санкцыя, якая шмат што змяніла ў нашым жыцці. Мы маем у Беларусі сем'і, сяброў, дзяўчын, мы павязалі з гэтай часткай Еўропы свае кар'еры. Многія з нас з'яўляюцца, напрыклад, спецыялістамі па экспарце на ўсходнія рынкі і забарона ўезду ў Беларусь часта бывае прычынай таго, што мы не можам атрымаць доўгачаканай і добрааплачванай працы. Навошта працадаўцу чалавек з такімі праблемамі, калі можна прыняць „спецыяліста па ўсходзе", які можа вольна ездзіць у камандзіроўкі не толькі ў Кіеў, але і ў Мінск, і Маскву?

** Аўтар з'яўляецца рэдактарам партала* ***www.porteuropa.eu***

Дзе сапраўдныя беларусы, там і „Ніва"

Карэспандэнты „Нівы" могуць шмат зрабіць у галіне распаўсюджвання нашага роднага штотыднёвіка. Я пацікавіўся, як зараз ідзе продаж беларускага часопіса ў крамах ГС у Плянце і ў Старым Ляўкове. У Плянту перасталі былі нават яе прывозіць! Цяпер усе экземпляры „Нівы" № 5 у Ляўкове і Плянце прадалі!

7 лютага г.г. я наведаў падпісчыка на „Ніву" Янку Харкевіча з Лешукоў. Спадар Янка пацікавіцца ці ёсць „Ніва" ў лешуцкай краме ды хто зацікаўлены ёю ў Лешуках апрача падпісчыка Яраслава Харкевіча (ён здаўна яе пастаянны чытач) ды ў Церамках і Міхнаўцы. Мне вядома, што ў Міхнаўцы дакладна чытае родны часопіс Аляксандр Харкевіч (ён аграном).

У Лешукі „Ніву" кожны тыдзень прывозіць пісьманосец Андрэй Лукша. Ён жыве ў блёку ў Бандарах. Там многа беларусаў. Варта запрапанаваць бандарскім жыхарам у блёках зрабіць падпіску на „Ніву". У блёку ёсць бібліятэка і ў ёй магла б быць „Ніва" на паліцы.

Мы з Янкам Харкевічам хочам, каб родны часопіс быў у бібліятэках у Старым Ляўкове і ў Семяноўцы. Тут жывуць амаль адны беларусы. Была б „Ніва" ў бібліятэцы, яе чыталі б. **(яц)**

Гмінная сацыяльная дапамога

Гмінныя самаўрады аказваюць дапамогу найбольш патрабуючым сем'ям. Гэтым займаюцца асяродкі сацыяльнай дапамогі. Рэалізуюць яны ўласныя і даручаныя задачы, якія датычаць:

— сямейных павіннасцей,

— дагляду інвалідаў, няздольных да самастойнага існавання,

— аліментацыйнага фонду,

— сацыяльнага забеспячэння.

Вось што мне сказала кіраўнік Гміннага асяродка сацыяльнай дапамогі ў Чаромсе Марыя Зіневіч:

— У мінулым годзе сямейнымі павіннасцямі пакарысталіся 225 сем'яў і мы выплацілі ім 893 147 зл. Каб атрымаць такую выплату, трэба было выканаць адно з ніжэйпрыведзеных крытэрыяў: — навучанне і рэабілітацыя інваліднага дзіцяці, выхаванне дзіцяці ў прыёмнай сям'і, навучанне дзіцяці па-за месцам пражывання (зварот коштаў даезду ў школу), пакрыццё выдаткаў звязаных з пражываннем у месцы, дзе знаходзіцца школа (зварот коштаў за інтэрнат).

Аднаразовыя дапамогі з выпадку нараджэння дзіцяці (бэціковэ) атрымалі 22 сям'і, а 24 сем'ям выплачана 96 820 зл. з аліментацыйнага фонду.

Сталым сацыяльным забеспячэннем пакарысталіся 20 сем'яў, выдалі 70 822 зл. Часовымі дапамогамі была ахоплена 91 сям'я, выплацілі 152 574 зл. Аднаразовую дапамогу прызначылі 199 сем'ям на закуп апалу, харчовых прадуктаў, лякарстваў і т.п., выдалі 5 580 зл. Дапамогай на харчаванне ў рамках праграмы „Дапамога дзяржавы ў сферы падкормлівання" пакарысталіся 169 вучняў, выдалі 84 707 зл. Аднаразовую выплату на закупку харчавання атрымала 258 асоб на суму 41 543 зл. ГАСД у мінулым годзе на падкормліванне агулам выдаў 126 250 зл.

Уладзімір СІДАРУК

Анна ФІРЛЕЙ

СУСТРЭЧА СУАЙЧЫННІКАЎ З МАГІЛЁЎСКІМІ АРТЫСТАМІ

Выступленне Ірыны Дарафеевай і Ігара Ляўчука

2 лютага адбылася сустрэча прадстаўнікоў Паморскага аддзялення Таварыства „Польшча-Беларусь" з магілёўскімі артыстамі, якія прыехалі ў Торунь, каб прыняць удзел у Днях культуры і эканомікі Магілёўскай вобласці ў Куяўска-Паморскім ваяводстве.

З вялікім поспехам у Палацы караля Артура прайшоў канцэрт салісткі Беларускай дзяржаўнай філармоніі, заслужанай артысткі Беларусі Ірыны Дарафеевай і артыстаў з Магілёва. Пачаўся канцэрт з выканання вядомай беларускай песні „Спадчына" на словы Янкі Купалы, музыку да якой напісаў Ігар Лучанок.

Выступленне І. Дарафеевай адбылося ў суправаджэнні знакамітага беларускага майстра ігры на народных інструментах Ігара Ляўчука. Артысты выйшлі на сцэну ў гістарычных дваранскіх строях Магілёўская вобласці, што надало канцэрту нацыянальны каларыт.

Цудоўным фонам гэтага мерапрыемства стала адлюстраванне на вялізным экране канцэртнай залы гістарычных падзей і маляўнічых краявідаў беларускай зямлі. Прадоўжылі канцэрт выступленні Інгі Кісялёвай, Алены Пішыкавай і Яўгена Курчых, якія выканалі творы на польскай, англійскай і рускай мовах.

Завяршыўся канцэрт выкананнем усімі ўдзельнікамі песні „Рэчанька" з рэпертуару І. Дарафеевай.

Пасля канцэрта маршалак Куяўска-Паморскага ваяводства Пётр Цалбецкі ўручыў артыстам кветкі і падзякаваў за добрае выступленне.

У гэты самы дзень наша арганізацыя разам з беларускімі партнёрамі правяла ў Палацы Артура фотавыставу „Беларусь і яе людзі". Магілёўская дэлегацыя падарыла Фонду „Цэнтр дыялогу культур імя Якуба Коласа" з Хэлмна беларускія нацыянальныя касцюмы.

Сустрэча з беларускімі сябрамі працягвалася вечарынай, на якую запрасілі беларускіх і польскіх студэнтаў, якія вучацца ва ўніверсітэце ім. Мікалая Каперніка ў Торуні. Яны прачыталі верш „Беларусы" нашага суайчынніка Уладзіміра Матусевіча:

Браткі-беларусы з маёй Беларусі!
Не часта мы разам збіраемся ўсе.
Успомніце сёння над стрэхамі бусла,
Ды спелыя слівы, што зранку ў расе.
Калісьці ў поле хадзілі па шчаўе,
Да хаты увечары з песнямі йшлі...

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Цёплы марозны вечар у Нарве

У зімовыя чацвяргі ў нарваўскай школе не цямнее. Настаўнікі і вучні на чале з паняй Нінай Абрамюк запрашаюць на цёплыя родныя вечарыны. Выступаюць на іх вучні розныя па ўзросце — ад маленькіх, што яшчэ толькі нядаўна пачалі вывучаць беларускую мову (бывае, што ўжо іхнія бацькі ведаюць яе менш за іх), да тых — ужо вядомых са школьных дэкламатарскіх, тэатральных сцэн і эстрад. У гэты вечар — 24 лютага — на вуліцы ціснуў люты мароз, а ў зале, аздобленай па-беларуску, было так цёпла і смачна! Прыйшлі калегі выступоўцаў са сваімі бацькамі, прыехалі і госці. Пачала пані Ніна, а пасля мікрафоны ўзялі Ян Аксэнцюк і Наталька Паскробка. І пайшло! Агнешка Петручук, Беата Асташэўская, Мартына Пякарская, Анжаліка Астапкевіч і Юльян Сямёнчык — яшчэ не раз іх пачуем! Некаторыя імёны ўжо больш вядомыя хоць бы і на тутэйшай сцэне — Карнелія Порац, Юлька Іванюк-Саўчук, Юлька Шкляжэўская, Дар'я Мікалайчык, Мацей Іванюк, Куба Кур'яновіч... Тамаш Франкоўскі, Андрэйка Аксэнцюк, Міхась Федарук. Оля Асташэўская, Габрыся Артэмюк, Беата Асташэўская, Міхал Сяткоўскі. Патрык Хадакоўскі, Вікторыя Лукашук, Магда Галёнка, Данілка Мінько, Мацей Іванюк, Андрэй Залускі. Патрыцыя Чэмерыс, Агата Беразавец. Крыстыян Паскробка — лаўрэат Гран-пры дэкламатарскага конкурсу. І вядомыя, ужо вялікія сяброўкі — Уля Беразавец і зорка — Дамініка Юшкевіч. З іх можна браць прыклад — з майстэрства ў песні, гавэндзе, дэкламацыі. Усе яны пачыналі на гэтай сцэне. Пачынаюць патрыятычна: *Беларус-беларус, не кідай ты зямлю, там твой дом і мама твая.* Гуляюць і смяюцца са сцэнак пра доктара, п'есы пра цара Ірада, пра недахоп слыху, пра суп... Узнагароджаны кожны — набраў адвагі, здабыў таксама і прыз. Калі нават толькі грамату — як Габрыся Селіванюк ці Іза Стульгіс — гэта яшчэ пакуль што. А пасля разбягуцца па школе — як па ўласным доме. І прыбяруць усё, як у хатцы.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Ізбор пагнаў снег з гор!

(З народнага календара)

Першы тыдзень **Вялікага посту** ў народзе называлі **Ізбор.** Людзі верылі, што ў гэтыя дні птушкі, якія зімуюць за морам, збіраюцца адлятаць у наш край.

6 сакавік, Цімафея. На Цімафея-веснавея звычайна бывае ветрана, спяваюць сініцы.

9 сакавік, Івана. Аднойдзенне галавы св. Іаана Хрысціцеля; у народзе дзень называлі ***Паўраценнем*** або ***Абратанне***). Гэты дзень асабліва шанавалі пчаляры. Яны заглядалі ў вуллі і глядзелі пчолак. Калі яны былі жывыя, пчаляр мог быць спакойны — пчолы паспяхова дачакаюцца вясны.

На Валожыншчыне верылі, што ***на Паўраценне*** мядзведзь паварочваецца на другі бок.

У гэтым годзе 9 сакавіка выпадае першая серада Вялікага посту вядомая ў народзе як ***Уступная серада.*** У Заходняй Беларусі гаспадыні збіраліся ў адной хаце, ставілі пасярэдзіне хаты пень ды скакалі праз яго. Гаварылі, што хто як падскочыць, такі высокі лён вырасце. У гэты дзень мылі верацёны, прадзівы для ільну, калаўроты — каб лён вырас чысты, без пустазелля. Вось як, не прымяняючы хіміі, людзі вырошчвалі чыстыя загоны плёнаў.

ЗОРКА

Музыка з кайфам

Рок на вакацыях ці *Rock in the Castle*

У інтэрнэце можна свабодна пераглядаць сабе старонкі, нібыта ў кніжцы. Розніца аднак у тым, што не чытаем нейкага расказа, апавядання ці рамана, а зрок наш бегае па цікавінках і ўсялякіх навінках. Калі я так „скакала" па сайтах звязаных з культурай, кінуліся мне ў вочы назвы гуртоў і музычных мерапрыемстваў. Напрыканцы зімы, гэтак званага клубнага сезона, калі гурты выступаюць перш за ўсё па музычных клубах, а яшчэ перад сезонам „оўпэнэраў", падумала я звярнуць увагу на моўныя з'явы ў назвах фестываляў і музычных мерапрыемстваў.

Спачатку здавалася, што зараз у Беларусі найбольш англамоўных назваў. Гэта амаль натуральная з'ява, якую мы ў Польшчы таксама спазналі ў 1990-х гадах, пасля адкрыцця краіны на Захад. З другога боку трэба помніць, што зараз культура стала больш глабальнай і міжнароднай, а свет музыкі шукае спосабаў, каб перасякаць усялякія межы, таксама і моўныя. Аднак сустрэла мяне неспадзяванка. Калі я пачала запісваць назвы мерапрыемстваў, аказалася, што зараз у Беларусі трэнд называць іх па-беларуску не менш моцны за гэты „заходні". *LIVEinROCK*, *WEROCK*, *Lets Rock* ці *Forward* паяўляюцца наперамен з *Камяніцай*, *Навальніцай* ці *Палянай*. Што цікава, часцей беларускамоўныя назвы прымаюць фестывалі пад адкрытым небам, якія прэтэндуюць на вялікія падзеі. Англійская мова крыху хаваецца па клубах, як у выпадку *Graffiti Open Music Fest*, *Rocking City* ці *Stop-motion*. Ёсць, зразумела, і выключэнні, бо ў памяшканнях, большых ці меншых, праходзяць фэсты *Глабальнае пацяпленьне*, *ЖывыГукON-line* ці *Бульфэст*. Гэты апошні варта ўспомніць, бо мае на мой густ вельмі беларускую назву, а гэта падзея, якая з'яўляецца адлюстраваннем музычных накірункаў у тэлешоў „Бульбокс". Ёсць і фэсты названыя па-англійску, якія праходзяць на адкрытых пляцоўках, як *Rock in the Castle*, але напэўна не дасягнулі такой папулярнасці як *Амбасовішча*, *Рок па вакацыях* ці заснаваны нядаўна фестываль *Рок за Баброў*, хіба першы вялікі фестываль з гэтак званым стратэгічным спонсарам у Беларусі, значыць тое, што ў свеце зараз лічыцца нармальнасцю, а лепш сказаць неабходнасцю! Зразумела, калі хочацца зрабіць нешта вялікае.

Добры фэст павінен мець напэўна добрую назву. Ці мова тут найважнейшая? Неабавязкова, але добра, калі ў мове захаванае тое, што найважнейшае — ідэя.

i_basovka@o2.pl

Яна спачатку спытала пра бежанства

*Размова з **Нінай Кучынскай**, бабуляй **Лідкі Пякарскай**, якой сямейныя аповеды і песні апынуліся ў „Падляшскіх хроніках".*

— Калісь старэйшыя людзі лічылі абавязкам перадаць гісторыю сваёй сям'і сваім унукам. Вам пра Вашу сям'ю распавядала бабуля?

— Не, у мяне не было роднай бабулі. Мой тата выхоўваўся ў чужых людзей. Бацька выгнаў яго малюткага з хаты. І тату прынялі да сябе чужыя людзі, выхоўвалі яго. Разам з прыёмнымі бацькамі ён падаўся ў бежанства. Яны былі ў Самары. Пасля, калі вярнуліся ў Пасынкі, бацьку было ўжо 17 гадоў. Зараз яго і ажанілі. Маёй маме не было яшчэ пятнаццаці гадоў. У шаснаццаць нарадзіла яна ўжо дзіця. Цяжкае ў іх было жыццё — поля многа, усё трэба было абрабіць рукамі.

— Ці Лідка пытала Вас пра канкрэтныя здарэнні, ці проста Вы апавядалі па чарзе, а яна выбрала патрэбныя ёй для спектакля гісторыі?

— Яна спачатку спытала мяне пра бежанства. А ў спектаклі апынуліся тыя здарэнні, якія я запамятала малой дзяўчынкай. Мне не было пяці гадоў, калі пачалася вайна. Старэйшага брата забралі ў Германію на прымусовыя работы. Пасля, калі ехалі немцы, хацелі забраць і малодшага брата. Памятаю як я з ім плакала, баялася, што забяруць ад мяне другога брата, што ён недзе загіне. Як сёння памятаю вайну. Сплюшчыш вока — усё ажывае, як бы *дзісь тое* бачыла. Як тая вайна пачалася, як танкі ехалі, як рускія ў сяло прыйшлі. Мой дзед, той няродны, астаўся дома, каб гаспадарку даглядаць. Рускія салдаты прыходзілі да яго, адзін з іх *старшэнства* прасіў, каб дзед мяне прывёў, бо ў яго ў хаце асталася такая дачушка як я.

— З гэтага цяжкага ваеннага матэрыялу Лідка злажыла разумны і кранальны аповед пра дзяўчынку, якая вяжа карункі, пра вайну ў Пасынках, пра жартаўлівую гісторыю з адной жанчынай. Як Вы адчуваеце сябе, калі з унукам можна гаварыць на адной мове? Гэта ў наш час рэдкасць.

— Я ганаруся сваімі ўнукамі, што яны шануюць нашу мову. Так павінна быць. Што вартае жыццё без свайго *языка*, без сваёй традыцыі?!

— А ці лёгка апавядаць пра мінулае маладым, гарадскім, жывучым у выгодзе і дастатку, людзям?

— Калі апавядаеш каму перажытае, то сёння гэта гучыць як казка. Але мне вельмі прыемна, што яны пытаюць і думаюць як мы калісь жылі, пераадольвалі беды і не падалі духам.

— Дзякую прыгожай бабулі за прыгожы аповед для чытачоў „Зоркі".

— Я таксама дзякую, што цікавіцеся.

ЗОРКА

Гэта былі эмоцыі, якіх не апісаць!

Мы пісалі ўжо пра спектакль беластоцкай моладзі „Ой даўно, даўно". Зараз нашы сябры выступаюць у вёсках і гарадах, звязаных са сцэнарыем спектакля і паасобнымі гісторыямі. У апошнюю нядзелю, 8 лютага г.г., беластоцкі тэатральны гурток, пад кірункам настаўніцы Аліны Ваўранюк, наведаў Пасынкі. Спектакль, на які з'явіліся людзі з вёскі і наваколля, быў горача ўспрыняты жыхарамі парафіі. Выступленне ў Пасынках — невыпадковае. Вось, адсюль гісторыя дзяўчынкі, якая ў пяць гадоў навучылася рабіць кручком карункавыя аздобы. Адначасова зазнала яна жахі і зверскасць вайны, боль расстання з блізкімі, бессэнсоўную гібель, пажар і галечу. Гэты аповед прадставіла Лідка Пякарская, вучаніца беластоцкай гімназіі № 7. Натхненнем і крыніцай для яе ролі была родная бабуля Ніна Кучынская. Адразу, пасля спектакля ў пасынскім дэпо, мы ўзялі інтэрв'ю ў Лідкі.

— Вашае прозвішча з Пасынак, гэта..?

— Іванюк.

— Ці часта бываеш у Пасынках?

— Не, не бываю тут часта, прыязджаю сюды, калі якія святы, калі ёсць нагода наведаць далейшых сваякоў. Зараз мая бабуля жыве ў Бельску. Аднак Пасынкі для мяне вельмі важныя, адсюль гісторыі маёй бабулі.

— Значыць, удзельніцтва ў спектаклі „Ой даўно, даўно" наблізіла Цябе яшчэ больш да Пасынак?

— О, так! Намнога больш адчуваю цяпер сувязь з гэтым месцам. Дзякуючы аповедам бабулі, я лепш разумею самую сябе, я разумею адкуль я! Ведаю таксама, што не трэба жыць у Пасынках, каб адчуваць эмацыянальную сувязь з месцам. Нават калі я тут не жыву, я адчуваю, што тут былі мае продкі і тут мае карані. Цяпер гісторыі маёй бабулі я ўспрымаю таксама як мае гісторыі.

— Карацей, Ты дзяўчына з Пасынак?

— Так. Перад выступленнем я вельмі хвалявалася як людзі ўспрымуць мой расказ. І калі я бачыла іх жывую рэакцыю, бачыла як перажывае гэта мая бабуля, гэта былі для мяне эмоцыі, якіх не апісаць...

— Другая трагічная гісторыя, якую Ты апавядаеш, з наваколля Браньска. Ці Ты хацела б расказаць яе сярод тамтэйшых людзей?

— Цяжка сказаць. Не ведаю ці там ёсць людзі, якія захочуць іх слухаць.

— Ты — гімназістка. Ці рэпетыцыі і паездкі разам з тэатральнай групай не адцягваюць Цябе ад навукі?

— Наадварот. „Падляшскія хронікі" мы ўжо рыхтуем ад некалькіх гадоў. Гэта важная і прыемная праца. Я лічу яе сваім абавязкам.

— Файныя словы. Лідка, жадаем Табе поспехаў на сцэне і ў жыцці.

— Дзякую.

Гутарыла ГАННА КАНДРАЦЮК

Польска-беларуская крыжаванка № 10

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 6:

Гук, слон, воля, кант, зман, мастак, лета, клей, гад, мяшчанства. Павук, слуп, ля, лешч, змей, Ян, мат, каса, грант, гіт, аса, каток, два.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі **Дыяна Галёнка, Наталля Тамчук, Патрык Сасна, Юстына Якубюк** з Бельска-Падляшскага, **Караліна Васілюк** з Гайнаўкі, **Крыстыян Грушэўскі, Анджаліка Галёнка** з Арэшкава. Віншуем!



Мар'ян Пецюкевіч у Крынках


Фота Бібліятэка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Згуртаванне „Тэрра інкогніта" з Крынак запрасіла 25 лютага г.г. у публічную бібліятэку на даклад з цыкла „У добрай кампаніі" доктар Гражыны Харытанюк-Міхей пра Мар'яна Пецюкевіча (1904-1983), выдатнага беларускага дзеяча, навукоўца, этнографа. Нарадзіўся ён на Браслаўшчыне ў вёсцы Цяцеркі ў каталіцкай сялянскай сям'і. Вучыўся ў Беларускай гімназіі ў Вільні і Радашковічах, вывучаў этнаграфію і этналогію ва Універсітэце Стэфана Баторыя ў Вільні, у 1938 г. атрымаў званне магістра філасофіі. Працу пісаў пра традыцыйную абраднасць стараабрадцаў. Быў актыўным дзеячам Беларускага студэнцкага саюза, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Беларускага навуковага таварыства, першым рэдактарам беларускага часопіса „Шлях моладзі", пісаў таксама ў „Крыніцу", „Калоссе". Вёў на віленскім радыё беларускамоўныя перадачы, быў дырэктарам Бібліятэкі імя Врублеўскіх, дырэктарам Беларускага музея. Працаваў інспектарам асветы, выкладаў беларускую мову. Пасля вайны жыў у Немэнчынку на Віленшчыне. У 1949 г. разам з сям'ёй быў арыштаваны і сасланы ва Ужур Краснаярскага краю. У 1952 г. быў сасланы на 25 гадоў у Варкуту. У 1957 г. быў звольнены і прыехаў у Польшчу, дзякуючы стараанням Міністэрства культуры і мастацтва ПНР, а перш а ўсё Зофіі Знамяроўскай-Пруферовай і Казімежа Машынскага. У 1959 г. пачаў працу ў Этнаграфічным музеі ў Торуні. Звязаўся з беларускім рухам на Беласточчыне, дзейнічаў у навуковым гуртку Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Быў адным са стваральнікаў літаратурага аб'яднання „Белавежа", арганізаваў этнаграфічныя экспедыцыі па Беласточчыне. Правёў этнаграфічныя экспедыцыі па Сакольшчыне і Гайнаўшчыне. Даследаваў Беластоцкі, Гайнаўскі, Сямятыцкі і Дуброўскі паветы. Пісаў у „Ніву", супрацоўнічаў з гісторыкамі. Бачыў патрэбу стварэння беларускага музея ў Польшчы. Апрацаваў „Апытальнік да народнага адзення, абутку і аздоб" (БГКТ, 1959) — яго вопыт у працы ў глыбінцы і метады апытвання не страцілі сваёй актуальнасці і выкарыстоўвала іх м.інш. наша даследчыца. У справаздачы з разведкі на Сакольшчыну звярнуў увагу на развіваючыеся ў той час ткацтва, сталярства і цяслярства, ганчарства, жывёлагадоўлю, апрацоўку скур і тканін ды харчоў, транспарт, на заваханыя яшчэ ў гаспадарках прадметы сялянскага абыходу. Падагуленнем даследавання этнографа з'яўляецца праца „Матэрыяльная культура Сакольскага павета" („Навуковы зборнік", 1964). Карэспандаваў таксама з жыхарамі вёсак (матэрыялы захаваліся ў Этнаграфічным аддзеле Падляшскага музея — перадаў іх Юры Туронак). Найчасцей экспанаты перадаваліся чыгункай. Жыхар Паўночнага Вострава пісаў: „Пане Пецюкевіч. Пісьмо ваша і грошы я атрымаў, з каторага я даведаўся, што мае прадметы знаходзяцца ў Торуні ў Музеі. Толькі я думаю, што магло стацца з жорнамі, хто мог адмяніць камень. Вы пішаце, што ён не падыходзіць да ніжняга, можа на станцыі гэты каторы прымае адмяніў свайму знаёмаму, бо гэта не я мяняў". Некаторыя, зразумеўшы, што іхнія рэчы сталі экспанатамі (значыць, яны важныя), спахапіліся, што можна за іх дастаць лепшыя грошы і можна патаргавацца (растлумачыць па часе справы ўзялася матушка Людміла Клімук з Вострава, прысутная на ўсіх мерапрыемствах арганізаваных Згуртаваннем). Пецюкевіч сабраў і навукова апрацаваў больш за тысячу экспанатаў. „Ніва" ў „Этнаграфічным куточку" змяшчала здымкі Мар'яна Пецюкевіча з экспедыцый і ягоныя апісанні. У Торуньскім музеі лічыўся Мар'ян Пецюкевіч спецыялістам па Беласточчыне. Пісаў у лістах: „Я, як этнограф-музеолаг, можа больш чым хто іншы душой хварэю, што на нашых вачах беспаваротна гінуць помнікі беларускай народнай культуры, якія мы, этнографы, называлі гістарычнымі дакументамі. (...) Я хіба адзін з'яўляюся кваліфікаваным і заавансаваным у беларускай этнаграфіі і таму лічыў сваім абавязкам зусім безінтэрэсоўна дапамагчы Таварыству ў гэтым высокім мерапрыемстве". Мар'ян Пецюкевіч (падпісваўся найчасцей ініцыяламі) пісаў у „Ніву" артыкулы пра беларускую мову, імёны і прозвішчы, пра традыцыйныя святы і абрады, успаміны пра дзеячаў беларускага руху, з якімі часта быў знаёмы, як з Браніславам Тарашкевічам. Пісаў таксама пад псеўданімам „Дзед Марцін" жартоўныя апавяданні пра свойскія слабасці. Сакрат Яновіч памятае яго як асобу апантаную беларускай культурай, пільнага і руплівага даследчыка, інтэлігентнага і з глыбокімі ведамі навукоўца. Варта было б з матэрыялаў Мар'яна Пецюкевіча надрукаваных у „Ніве" скласці зборнік, які зацікавіў бы не толькі этнографаў гэтым незвычайным таленавітым і адданым справе беларускай культуры чалавекам, якога так выпрабавалі лёс і гісторыя.

Сустрэчу спансараваў Андрэй Гарбуз з Аб'яднання „Сакольшчына".

Плебанова (фота М. Пецюкевіча)

Кошыкі на рынку ў Саколцы (фота М. Пецюкевіча)

Свіран і аборы. Вярхлесе (фота М. Пецюкевіча)

Ніна БРУЧКО

ЛЮБІНА ДАРОГА ДА ШЧАСЦЯ (Ч. 2)

Пачатак жніўня. Скончылася спякота, другі дзень на небе паяўляюцца чорныя хмары, валіць дождж. Сёння раніцай працінаді неба сваімі бліскамі маланкі, білі перуны. Па бруку вуліцы шпарка плылі яругі вады. Што за пэха малечам! — думала Любка, узіраючыся праз мурзатыя шыбы ў вокнах. А ёй жа трэба заўтра ехаць у Бельск, па працу.

Назаўтра раніца стала сонечная, быццам учора нічога не было. Неба чысценькае, а сонца радасна моргае падымаючыся штораз вышэй і вышэй. Паветра лёгкае, чыстае, а ў садку пераплятаецца шчэбет птушак.

Любка паспешна выцягнула са шпіхера бацькаў веласіпед і адчыніла драўляныя вароты. Ужо была на вуліцы, калі маці крыкнула, адчыніўшы акно, ёй услед:

— А ровар пастаў у знаёмых пры Беластоцкай, каб ніхто не ўкраў!

— Добра, добра, мама! — кінула Любка і памчалася па вёсцы. Хаця веласіпед быў цяжкаваты, з рамай, 15 кіламетраў хутка адолела. У дарозе толькі дзве машыны яе мінулі, ды штораз апярэджвала фурманкі з дзядзькамі і цёткамі на вазах або з прывязанымі каровамі ды квікаючымі ў скрынках падсвінкамі. „Сёння ж чацвер, базар! Буду назад вяртацца праз вёскі, наўпрасткі, будзе спакайней і дарога карацейшая, хаця цяжэйшая!" — падумала Любка.

Перад вачыма Любкі паказаўся ўрэшце будынак Аддзела асветы. Яна хуценька ўбегла ў калідор і вачыма шукала кабінета кадраў. О, вось гэтыя дзверы! Сэрца заламатала мацней, у галаве закалаціліся думкі: „Што сказаць, як пачаць размову? А мо ўцячы? Не, не ўцяку, увайду, усё скажу, што трэба, я ж ужо дарослая, мне семнаццаты год ідзе...".

Старэйшы мужчына ўстаў з-за пісьмовага стала, прывітаў Любку ўсмешкай, узяў яе прашэнне і біяграфію, напісаную аж на дзвюх старонках вялікіх лістоў паперы, зірнуў на яе і спытаўся:

— А колькі табе гадоў, паненачка?

— Ужо неўзабаве будзе семнаццаць! — дрыжачым голасам сказала Любка.

Чыноўнік пакруціў галавою і далей з лагоднай усмешкай сказаў:

— А, можа, мне што-небудзь скажаш аб Японіі, або пра апошнюю вайну, хто нас вызваліў?.. — пытанні пасыпаліся як з рукава.

Любка забыла пра страх і пачала „сыпаць" сваімі ведамі. „Экзамен" здала хіба на выдатна, бо мужчына зноў шчыра ўсміхнуўся і сказаў:

— Ну дык едзь дамоў, мы хутка прышлем табе паведамленне з адказам.

Дзяўчына падзякавала і хуценька, задаволеная сабою, выбегла на вуліцу.

І праўда, праз тыдзень Любка атрымала „наказ працы" ў суседняй вёсцы.

— Урэшце дасягнула я свайго: буду настаўніцай, буду вучыць дзяцей і сама вучыцца, яшчэ тры гады педліцэя, а потым мо і вышэй пайду! — цешылася Любка.

Першае верасня было ўжо блізка.

— І ў што я апрануся?! — баялася дзяўчына.

Назаўтра маці паехала ў горад, прадала кошык яек, здала ў скупцы воўну і купіла дачцэ шэранькі матэрыял на касцюмчык.

— Ой, якая цудоўная тканіна, а як пахне новенькім, мамачка! — аж крыкнула ад радасці Любка, разгарнуўшы пакупку. Праз пару дзён краўчыха Насця пашыла ёй касцюмчык — першы ў яе жыцці.

Праляцеў апошні тыдзень жніўня і паслязаўтра дзеці мелі ісці ў школу. Дзень да пачатку вучобы маці запрагла каня ў жалязняк і, спакаваўшы тое-сёе, паехала з дачкой у чужую вёску. Ехаўшы, абедзве маўчалі, а ў галаве Любкі клубіліся ўсялякія думкі: якія там настаўнікі, як яе прывітаюць, як справіцца яна з дзецьмі...

Маці завезла Любку да сваякоў і папрасіла даць дачцэ пакойчык, пакуль тая не нойме сабе кватэры.

Настаўніца са школы ў Плёсках Тацяна Асташэвіч з малымі вучнямі (фота з архіва „Ніввы")

У першы дзень новага школьнага года прыпадала вялікае прыхадское свята. Любка ўжо з самай раніцы пайшла ў школу, ды ніякіх дзяцей там не было, усе святкавалі — пайшлі ў царкву. У школе, якая была раскінута ў дзвюх вясковых хатах, сядзелі толькі маладыя настаўнікі: кіраўнік школы і настаўніца. Прывіталі яе сімпатычна і Любка атрымала абавязкі на заўтрашні дзень ды вярнулася да сваякоў.

Да цёткі Палашкі і дзядзькі Хведара таксама прыехалі госці. І хаця ў хаце было весела і людна, Любка маркотная сядзела за сталом і не азывалася. Усё думала пра заўтрашні дзень: як прывітаюць дзеці маладзенькую настаўніцу?

Вучняў было шмат, хоць вёска не вельмі вялікая. У кожнай зале вучыліся два класы, урок трэба было дзяліць па палове: з адным класам весці размову, другі працаваў ціха. Ды не здзівіла гэта Любкі — у яе вёсцы было тое ж самае, хаця школьны будынак быў вялікі, затое дзяцей было ў іх вельмі многа.

І так праходзілі дзень за днём. Любка здружылася з настаўніцай Зінай і з кіраўніком Пецем. Усе яны былі амаль аднаго ўзросту. Знайшла сабе кватэру блізенька школы ў сімпатычнай цёткі Варкі, якая жыла адна пасля смерці мужа. Дзяцей у гаспадыні не было, таму палюбіла маладзенькую сціплую Любку і адносілася да яе як да роднай дачкі. Дагаджала — смачна варыла, пякла румяныя булачкі з яблыкамі.

Зіма ў той год пачалася рана. Што буду рабіць доўгімі вечарамі? — думалася Любцы. Нат кніжкі няма дзе пазычыць! Таму і сталі збірацца настаўніцы ў хаце цёткі Варкі. Сядзелі пры цёплай сцяноўцы і спявалі песні, аж рэха неслася на вуліцу. Няраз хлопцы прыбягалі пад вокны паслухаць. Час ад часу дзяўчаты хадзілі на танцы — музыкант быў вясковы, пустая хата ў канцы вёскі... Маладым хацелася паскакаць. А ў буднія дні блукалі хлопцы па вуліцы, шукаючы дзяўчат, якія збіраліся з рукадзеллем: вязалі світары або вышывалі абрускі. Там і пахіхікаць можна, і ў карты падзяжыць, а то і гарэлачкі кульнуць.

— Зіна, мо ў нашай вёсцы сарганізаваць вучобу для дарослай моладзі, хай кончыць пачатковую школу, як у суседняй? — прыйшло ў галаву аднойчы ўвечары Любцы. — Хто ведае, мо каторы будзе здабываць веды на вячэрніх або карэспандэнцыйных курсах? Тады і працу лягчэй здабыць у горадзе. А старэйшых трэба навучыць чытаць і пісаць, перастануць падпісвацца крыжыкам! Мая сяброўка Вера з беларускага ліцэя па прыдзелу навучыла чытаць і пісаць пажылую цётку Марыю!

— Гэта цудоўная справа! — падтакнула Зінка. — Трэба ўсё абмеркаваць з пачаткам новага школьнага года.

Канчаліся запусты, апошняя забава. Хлопцы нанялі вясковага музыканта Мішу, дзяўчаты прыбралі залу ў старой хатцы-святліцы. Дзень запустаў быў пагодлівы. Вечарэла. Любка, уваткнуўшы нос у вучнёўскі сшытак, чытала апавяданне. Раптам за акном паплыла „каробушка". Усадзіла Любка голаў у незавешанае акенца і, пакінуўшы сшытак, крыкнула:

— О, уся грамада хлопцаў, з гарманістам, ідуць на музыкі, пабягу і я з Зінкай!

Любка хутка апранула ваўняную карычневую, з белым гафтаваным каўнерыкам сукенку, прычасала нядаўна зробленую ў горадзе завіўку-андуляцыю, пацягнула чырвонай памадай поўныя губы, далікатна пэцнула колерам і шчокі і, трэснуўшы дзвярыма, выбегла з хаты, спяшаючыся да Зінкі. З самога парога крыкнула:

— Апранайся хутчэй, інакш не ўлезем у залу, калі напхаюцца бабы! Мо прыедуць хлопцы з іншай вскі, мо які прыгажун улезе ў вока?

— Ды што мне адзець, Любка?! — незадаволена, здымаючы з цвічка на сцяне сукенку, прабурчала Зінка. — У мяне ж толькі вось адна сукенка, да таго амаль такая самая як у цябе!

— Ну і што — іншы ж колер, ды ўсе дзяўчаты пашылі такія самыя, прыгажэйшага матэрыялу са свечкай не знойдзеш. Важна, што модная, і ўсё! — Любка бадзёра падтрымлівала сяброўку.

Танцы якраз раскручваліся. Любка з Зінкай не паспелі сесці на лаву, як іх падхапілі да танцаў. У перапынку дзяўчаты цягнулі: „Ой, Романэ, Романочку" і зараз падтрымлівалі іх хлопцы. Раптам уварвалася ў залу гурба малодчыкаў з суседняй вёскі. Прымчаліся сюды на веласіпедах.

— О, глядзі, Любка, гэты што спераду — гэта Віця, Манін нарачоны, толькі што прыйшоў з войска! — Віця адразу накіраваўся ў кут, дзе сядзела Маня.

— Бачыш, відна адразу: адрозніваецца ад вясковых сяброў; глядзі — кучаравыя валасы, шэры касцюмчык і беленькі, як снег, шалік... Як амант з фільма, што ж, заняты... — шапнула Любка Зінцы ў вуха.

Бабы спыніліся ў прытворку. А маладыя танцавалі танга, вальс або польку, то зноў зацягвалі песню. Хтосьці крыкнуў гучней за гармонік:

— Б'юцца, уцякайма! — а гарманіст пачаў яшчэ гучней рэзаць „Ой, полна, полна моя коробушка". Людзі сталі таўкацца, хлынулі ў дзверы, а піск дзяўчат заглушваў крык хлопцаў...

Любцы і Зінцы ўдалося прапхнуцца паміж б'ючыміся і выбегчы на панадворак. Без аглядкі пабеглі дамоў.

Насталі кароткія, снежныя і халодныя дні. Любчына куртка-канадыйка была захалодная.

— Зіначка, давай заўтра паедзем у Беласток, купім цёплае паліто, у што ж апранемся на Каляды, а ў школе заняткаў няма, мы свабодныя! — запрапанавала Любка. Зінка ахвотна згадзілася з прапановай сяброўкі — у яе ж таксама не было цёплага адзення. Дагаварыліся паехаць у пятніцу.

На дварэ было пахмурна, дзьмуў вільготны вецер, на вуліцы ляжаў снег. Сяброўкі выйшлі з хаты раненька, каб як найхутчэй дайсці да шашы і „злавіць" грузавік.

— Бач, Любка, як нам пашчасцілася, шафёр узяў нас у кабіну, інакш замёрзлі б... А да таго і грошыкаў не захацеў, за „дзякую" прывёз, — цешылася Зінка, выйшаўшы ўжо ў горадзе.

— Ага, хіба спадабаліся яму маладзенькія і, скажу сціпла, прыгожыя дзяўчаты! — азіраючыся вакол сказала Любка. — Ну, цяпер пойдзем шукаць магазінаў...

Дзяўчаты вярнуліся дамоў пад самы вечар. Убеглі ў хату цёткі Варкі з хіхатаннем, трымаючы ў адубянелых пальцах вялікія пакеты.

— Ну, паказвайце, дочанькі, што вы купілі! — нецярплівілася цётка.

Сяброўкі развязалі пакункі, кожная апранула сваё паліто і пачалі прахаджвацца вакол печкі, як на паказе моды.

— О, людочкі мілыя! — пляснула рукамі цётка. — Гэта ж такія самыя паліто, а да таго бела-шэрыя. Выглядаеце як блізнючкі...

— Цётка Варка, прыгажэйшых не знайшлі, абабеглі ўсе крамы — усюды такія самыя! Да таго будзем плаціць штомесяц за іх крэдыт!

працяг ☞10

1 ☞працяг

ЛЮБІНА ДАРОГА...

— з меншым ужо энтузіязмам сказала Любка.

— Хіба ж не будуць празываць нас цыганкамі, як тады, калі мы купілі доўгія каляровыя спадніцы з „рэштак"! — прыгадала Зінка.

— А я аддала б увесь заробак за такую сукенку, як у вас, цётка, такую шаўковую, галубовую ў сінія гарошкі, — з жалем у голасе азвалася Любка.

— Або тая спадніца ў кантрафалды... Цуда!

— Ой, даражэнькія, усё гэта я купіла даўно, служыла я ў яўрэяў, у горадзе. У магазінах вочы разбягаліся, абы грошыкі былі! — уздыхнула цётка.

— Шкада, шкада, што цяпер няма такіх крамаў і мы апранаемся як старыя цёткі! — паківалі галовамі дзяўчаты.

І так Любцы і Зінцы праляцела зіма. Прыйшла вясна, вёска ажыла, штораз брукаванкай траскатаў жалязняк з бабамі і мужыкамі ў возе, якія ехалі ў поле сеяць або садзіць картоплі. А моладзь не блукалася, як зімою. Да таго быў блізкі пост — ані забавы, ані вяселлі не трапляліся.

Тыдзень перад Вялікаднем у залу (настаўніцкага пакоя ў школе не было) увайшоў знерваваны кіраўнік школы і крыкнуў:

— Сяброўкі, рыхтуйцеся, прыехаў візітатар з Бельска, будзе на вашых уроках, старайцеся, каб усё было добра.

Любка з Нінкай шпарка падняліся з крэсел, схапілі свае канспекты і кожная пабегла ў свой клас.

Любка села за настаўніцкі стол, круцілася неспакойна ў крэсле, чакаючы званка і пачатку ўрока рускай мовы. Звякнуў званок, у клас увайшлі надзвычай спакойна вучні, а за імі старэйшы мужчына. Прадставіўся, прывітаўся з умешкай, і сеў за апошняй партай. Лагодны твар мужчыны успакоіў крыху Любку і яна таксама пачала весці ўрок на тэму пабудовы моладдзю горада Магнітагорска. Дзеці чыталі, расказвалі і здавался, што ўсё ідзе нармальным ходам. Урок кончыўся, вучні выбеглі на перапынак.

— Ну, адкуль вы так добра ведаеце рускую мову? — спытаўся візітатар, падышоўшы да Любінага стала.

— Я ж вучылася рускай мове ў пачатковай школе, а цяпер у педліцэі, — адказала больш ужо адважна Любка.

— Вось, сяброўка Люба, падабаўся мне ваш урок, толькі вы забылі аб чымсьці важным — аднесці гэта да пабудовы Новай Гуты! — сказаў мужчына, развітаўся і выйшаў з залы.

Любка пасядзела яшчэ момант за сталом, аддыхнулася, сабрала манаткі і хутка накіравалася ў хату. Увесь дзень у галаве таўкліся словы: „Забылася, забылася".

У той час вельмі хацелася Любцы закончыць педліцэй, здабыць больш ведаў, стаць добрай настаўніцай. Рашыла не раздумваць пра сваю няўдачу, а налегчы на вучобу.

Хутка мінула велікоднае свята. Надышлі сонечныя, цёплыя дні. Вёска павесялела — ізноў забавы, вяселлі. Дзень святога Міколы быў цёплым днём, прыпаў у нядзелю. З самай раніцы ў хату прыбегла суседка Нінка і ад парога грымнула:

— Ой, Варко, чула я, што Маня выходзіць замуж, неўзабаве будзе вяселле, былі ўжо ціхія дзіваснубы...

— За Сцёпу, праўда? — пацікавілася Любка.

— Куды там, сваякі прывезлі кавалера з суседняй вёскі, кажуць, бачылі, байкаваты хлопец, багаты, адзін у бацькоў, толькі крыху накульгвае...

— Немагчыма, Маня не пойдзе, яна ж закаханая ў Сцёпу, чакала, аж вернецца ён з войска!

— Бацька сілай аддае, пра Сцёпу і слухаць не хоча — бедныя бацькі ў яго, няслаўныя. А Маня хаця і красуня, прывыкне, кажа, пра каханне забудзе. Піліп жа, ведаеш, Варко, чалавек сур'ёзны, ніхто яму не падскочыць, ды і слёзы дачкі не скрушаць яго сэрца... Вяселле хуценька! — зарагатала на канец цётка Нінка.

Два тыдні праляцелі мігам. Адбылося вяселле. Маню павезлі да мужа ў чужую вёску, а бабы перасталі вохкаць і ахкаць.

Недалёка канец школьных заняткаў, больш працы і ў вучняў, і ў настаўнікаў. І на гаспадарцы ўсё больш работы, людзі выйшлі ў поле.

Штораз больш вучняў прапускала ўрокі або прыходзілі не зрабіўшы хатніх задач. Надзька, вучаніца шостага класа, ужо ўвесь тыдзень не рашала хатняй працы з матэматыкі і іншых прадметаў. Каб памагчы дзяўчынцы, Любка і Зінка пакідалі дзяўчынку пасля ўрокаў. Выходзілі ж ёй двойкі з матэматыкі і польскай мовы! Настаўніцы не звярталі ўвагі на крыкі і смехі яе сяброў: „Надзька ў казе засталася!". Любка з Зінкай сядзелі ў класе, правяралі сшыткі сваіх вучняў, а Надзька за апошняй партай у зале рашала хатнія задачы. Раптам дзверы з лёскатам адчыніліся, убегла абураная маці вучаніцы, схапіла яе за рукаў, ледзь тая паспела ўзяць сумку з кніжкамі і пацягнула з класа з крыкам: „Сядзіш тут, траціш час, а ўдома трэба картоплі ашчыквацьі..". Настаўніцы глянулі па сабе і грымнулі смехам. Больш ні аднаго вучня не пакідалі ў „казе".

Надвор'е рабілася ўсё цяплейшым, надыходзіла лета... і канец школьных заняткаў, канікулы. Працы ў школе шмат: выставіць ацэнкі, выпісаць пасведчанні, сарганізаваць заканчэнне школьнага года... Прыйшоў час развітвацца з вучнямі і сябрамі.

* * *

Любка вярнулася да бацькоў і неўзабаве паехала на школьныя заняткі ў педліцэй у горад. На працу ў вясковую школу больш не вярнулася. Знайшла занятак у горадзе, закончыла вучобу ў педліцэі і паступіла ва ўніверсітэт. Працуючы, здабыла дыплом магістра. Выйшла замуж, нарадзіла трое дзяцей. Настаўнічала ў гарадскім агульнаадукацыйным ліцэі і адтуль пайшла на заслужаную пенсію. Цяпер часта, асабліва ў Дзень настаўніка, успамінае сваю крутую дарогу да шчасця. Выпала яна на долю не толькі яе, ды большасці таго пакалення. А ўсё ж на душы ў Любкі лёгка — яна здзейсніла свае мары, хаця не да канца ўсе. Цешыць яе, што ўсе яе родныя дзеці — адукаваныя. Мелі яны іншую — простую і лёгкую — дарогу да свайго шчасця.

С БЕЛАРУСІ

Ёсць у Беларусі невялікая вёсачка, нібыта схаваная сярод балот і лясоў на ўсходнім ускрайку Міншчыны, з якой звязаныя лёсы выдатных дзеячаў беларускай літаратуры і мастацтва. Гэта — Талька. Менавіта ў ёй летам 1933 і 1934 гадоў жыў Якуб Колас. У 1952-1954 гадах настаўнікам Талькаўскай школы працаваў пісьменнік-сатырык Міхаіл Скрыпка. У Тальцы ў 1910 годзе нарадзіўся Іван Шаціла, акцёр тэатра і кіно, народны артыст БССР.

Пэўна, кожная вёска мае нешта незвычайнае альбо ў сваёй гісторыі, альбо ў сучаснасці. Але далёка не ў кожнай знойдуцца рупліўцы, якія здолеюць прэзентаваць сваю малую радзіму цэламу свету праз інтэрнэт. Талькаўцы, агульная колькасць якіх не перавышае паўтысячы чалавек, удала гэта зрабілі. Сведчаннем таму з'яўляецца сайт, што месціцца па адрасе www.talka.info.

Зайшоўшы на сайт, складаецца ўражанне, што нібыта нечакана для сябе чытач апынуўся ў залітай сонцам гаманлівай вёсачцы, дзе праз расчыненыя вокны вецер павыцягваў на вуліцу белыя з арнаментам фіранкі. Шэпат лісця, блакітнае неба, невялікая рачулка, імя якой тое ж, што мае вёска — усё гэта нібыта льецца з галоўнай старонкі сайта „Талька і наваколлі".

Акурат пад назвай рухаецца бягучы радок, які дае тлумачэнне, для каго створаны даны сайт — для тых, хто „хоча адпачываць у нашай мясцовасці, хадзіць у паходы, збіраць ягады і грыбы; — займаецца краязнаўствам; — мае патрэбу даць абвестку пра свой бізнес ці гаспадарку; — хоча знайсці аднадумцаў, сяброў".

Першая старонка „Талькі і наваколляў" з большага аддадзеная пад навіны. Абнаўляюцца яны не вельмі часта, але даволі своечасова, зважаючы на павольнае сялянскае жыццё не надта перасычанае разнастайнымі падзеямі. Адна з апошніх, якая, дарэчы, стала вядомай цэлай Беларусі — звальненне настаўніцы гісторыі Талькаўскай сярэдняй школы Наталлі Іллініч. Яна выкладала свой прадмет цягам 26 гадоў, а напрыканцы студзеня была выкінута з працы за актыўны ўдзел у перадвыбарчай кампаніі апазіцыйнага кандыдата на пасаду прэзідэнта Беларусі Рыгора Кастусёва.

Сайт вёскі змяшчае вялікую колькасць рубрык. Аматары роднага краю, здаецца, не абмінулі ніводнай акалічнасці, распавядаючы пра яго прыгажосць. У гэтым можна ўпэўніцца ў рубрыцы „Прыродныя аб'екты", дзе распавядаецца пра крынічку Кіпячку і возера Грымячае.

Старонка „Культурныя аб'екты" распавядзе пра храмы і археалагічныя помнікі ў талькаўскім наваколлі. Зразумела, „дзякуючы" савецкай уладзе, старых царкоўных будынкаў амаль не захавалася. Затое з'явілася царква, якая чамусьці не ўзгадваецца на гэтым краязнаўчым сайце, але месціцца ў Тальцы — нейкі цагляны аднапавярховы будынак, больш падыходзячы на нейкі склад, на плоскім даху якога ўсталяваны праваслаўны крыж. Пабачыць такую недарэчную выглядам царкву можна на сайце http://kuznetsov.by/?p=378.

Калі ж вяртацца ў „Тальку і наваколлі", то вартым увагі падаецца старонка „Славутыя людзі", дзе ўзгадваюцца Якуб Колас, Міхаіл Скрыпка, Іван Шаціла і іншыя выдатныя асобы. Віртуальна пагартаць стары, амаль што сямейны, талькаўскі фотаальбом можна на старонцы „Фотагалерэя".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Вострая Брама

Здаецца, першым у віленскую Вострую Браму ці да яе, зацягнуў мяне мой аднакурснік і сябра па гістарычным факультэце Гродзенскага ўніверсітэта Уладзя Канановіч. Ён раней іншых з нашай студэнцкай кампаніі прасякнуўся духам велічы старадаўняй крывіцкай сталіцы і проста трызніў Вільняй, у рознай ступені запаляючы сваім непадробным і вечна юнацкім імпэтам іншых. З канца 1980-х гадоў мінулага стагоддзя перыядычныя вандроўкі ў Вільню сталі асабіста для мяне абсалютнай патрэбай, а наведванне Вострай Брамы — абавязковым рытуалам. Зазвычай у адзін прыезд гэта адбываецца двойчы — спярша ад вакзала па дарозе ў горад, пасля ў зваротным кірунку. Не заўсёды стае часу падняцца ў капліцу каб укленчыць перад абразам Вострабрамскай Божай Маці — апякункі ажно дзвюх краін. Мы заўсёды некуды спяшаемся ў мітусні дзён. На жаль, год таму падчас няўдалай рэстаўрацыі ранейшыя прыступкі, па якіх пілігрымы ішлі сто гадоў, былі заменены на новыя сходы з імітацыі граніту. Таксама былі дэмантаваны старажытныя дзверы, на керамічную плітку пакладзена новая падлога, заменены парэнчы.

Бадай аніводнае архітэктурнае збудаванне на беларускай зямлі не атрымала столькі паэтычных і музычных прысвячэнняў. Першым у шэрагу творцаў, канешне, Максім Багдановіч са сваім славутым „успомню Вострую Браму святую". Герб „Пагоня" дагэтуль упрыгожвае гэты шэдэўр дойлідаў, які ў старажытнасці называўся таксама Медніцкай Брамай. Назва Медніцкая тлумачыцца зусім проста — гэты выезд і дарога вялі ў кірунку Меднікаў (цяперашні Мядзініінкай). Ёсць версіі, што назва „Вострая" паходзіць ад стромых гатычных шпіляў на колішняй вежы, ці ад назвы квартала Вільні — Востры Канец, ці ад формы вуліцы, якая звужаецца каля брамы, ці ўрэшце ад родавага імені Канстанціна Астрожскага. Летувіская ж назва „Aušros Vartai" („Брама Світанку") з'явілася ў жмудзінскіх газетах толькі ў XX стагоддзі і не ёсць слушнай, бо брама пастаўленая зусім не на ўсход.

У XVIII стагоддзі „з сярэдзіны" да Медніцкай Брамы была дабудавана мураваная капліца, дзе дагэтуль змяшчаецца цудатворны абраз Маці Міласэрнасці. Напэўна Багародзіца і зберагла архітэктурны шэдэўр для нашчадкаў. Вострая Брама — гэта толькі рэшткі абрысу даўняй мураванай сцяны XVI стагоддзя, якой быў абкружаны стары горад. Але ўражанне такое, што і сёння ўвайсці ў яго магчыма толькі праз яе. Растлумачыць, што такое Медніцкая Брама ў архітэктурным плане могуць толькі адмыслоўцы-прафесіяналы. Па-першае, яна зусім не „вострая", па-другое, напэўна не мае аналагаў, па-трэцяе, не раз перабудоўвалася. Але для шырокага кола наведнікаў гэта не істотна. Важна, што адразу за Вострай Брамай адкрываецца цэлы „россып" адметных помнікаў архітэктуры і беларускіх адрасоў Вільні: Базыльянскія муры, праваслаўны Свята-Духаўскі сабор з манастыром, каталіцкі касцёл Святой Тарэзы, будынкі колішняй Беларускай гімназіі і былога Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, месца, дзе стаяла кнігарня Станіслава Станкевіча, дом, дзе жыў Сымон Рак-Міхайлоўскі...

Вострая Брама — гэта не звычайныя вароты ў горад ці з яго, гэта не проста дарожны шляхавод, гэта не толькі аб'ект рэлігійнага паломніцтва. Гэтая брама — асаблівы сімвал для кожнага беларуса, гэта Брама неўміручасці нацыі. Вострая Брама — адзіная з дзевяці старажытных віленскіх брам, якая ацалела. Яна вядзе да Меднікаў і далей ужо ў сучасную Беларусь у кірунку цяперашняй сталіцы — Мінска. Яшчэ адзін знак і гарантыя таго, што пакуль яна ёсць, жыве і наша гістарычная памяць.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

АБ'ЯВЫ

Сардэчна запрашаем на спектакль

«Ой, давно, давно»

(Беларускія гісторыі з Падляшша)

у выкананні вучняў з Беластока, якія раскажуць гісторыі сваіх бабуляў, дзядуляў і бацькоў — сведкаў падзей, што адбыліся на нашай зямлі.

05.03.2011г. у 17.00

у Гмінным асяродку культуры ў Чыжах

Stowarzyszenie na rzecz dzieci i młodzieży uczących się języka białoruskiego „AB-BA"

Zrealizowano przy wsparciu finansowym Urzędu Marszałkowskiego Województwa Podlaskiego

Кафедра беларускай культуры

Філалагічны факультэт Універсітэта ў Беластоку запрашае на

Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый

мгр **Яўген ВАПА**

Культурастваральная роля „Нівы" - тыднёвіка беларусаў у Польшчы з нагоды 55-годдзя

10 сакавіка, пачатак у 17.00, вул. Лінярскага 3, зала 1Б

Здзек над экспанатам — працяг

Віктар БУРА

У першым сёлетнім нумары „Нівы" (ад 2 студзеня г.г.) друкаваўся мой допіс „Здзек над экспанатам" пра незайздросны лёс воўначасалкі з Сакольшчыны — унікальнага экспаната, якому больш за сто гадоў, а якому няма месца пад музейным дахам. Увесь год стаяў ён пад адкрытым небам ды нішчэў.

Месяц пасля публікацыі пацікавіўся я далейшым лёсам экспаната. 9 лютага падаўся я ў Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы і пабачыў, што воўначасалка далей стаіць на тым самым месцы на музейным панадворку. Зрабіў я здымак і падаўся ў адміністрацыю музея.

Выконваючы абавязкі дырэктара Тамаш Ціханюк сустрэў мяне не вельмі радасна, з насцярожанасцю. Прыгадаў я яму свой допіс пра воўначасалку, што друкаваўся ў „Ніве", і спытаў чаму працаўнікі музея дазваляюць, каб унікальны экспанат знішчаўся. Дырэктар адказаў: „Для гэтага экспаната няма месца ў Беларускім музеі". Мне стала і страшна, і сумна. Незразумелым для мяне было тое, аб чым думае і што гаворыць дырэктар. Я заявіў, што калі экспанат далей будзе нішчэць пад адкрытым небам, тады справай зацікаўлю тэлебачанне і пакажу народу як гора-музейнікі бяз-

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Воўначасалка на музейным пляцы — 9.02.2011 г.

душна ставяцца да матэрыяльнай спадчыны нашых продкаў. Дырэктар у адказ заявіў: „Я тэлебачання на музейны пляц не ўпушчу". На развітанне я дадаў: „Барані вас Божа, каб гэты экспанат вы паспрабавалі знішчыць. Ой тады то будзе...".

У суботу 19 лютага пайшоў я зноў у тое месца, дзе стаяла нялюбая музейнікам воўначасалка і на маю радасць яе там ужо не было. Што з ёю сталася памалу буду высвятляць і інфармаваць чытачоў „Нівы".

Запрашэнне да конкурсу

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Гайнаўскі дом культуры і Музей у Бельску-Падляшскім аб'яўляюць конкурс на найпрыгажэйшыя гафты і карункі Гайнаўскага і Бельскага паветаў. Удзельнічаць у ім могуць рукадзельнікі-аматары.

На конкурс трэба прынесці дзве працы, напрыклад, сурвэты, абрусы, вышываныя ручнікі, дываны, кілімы, вышываную пасцельную бялізну.

Працы можна выканаць у трох катэгорыях:

I — адвольная тэхніка гафту (рышэлье, крыжык, гафт плоскі, гафт на канве),

II — адвольная тэхніка карункі (кубікавая, карункавая, іголкавая, фрыволіка, кручком),

III — мешаная тэхніка (гафт і карунка).

Працы прымаюцца да 20 сакавіка 2011 года ў Гайнаўскім доме культуры, вул. Тамары Саланевіч, 4.

Па дэталёвую інфармацыю можна патэлефанаваць у ГДК Зінаідзе Якуць і Анне Тарасюк — нумар тэлефона (85) 6823203 або ў Музей у Бельску-Падляшскім Аліне Дэмбоўскай — (85)7302044.

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу Васіля Віткі.

1. злакавы конскі ласунак = 10 _ 11 _ 12 _ 72 _;
2. Зеўсава гара = 86 _ 85 _ 84 _ 24 _ 83 _;
3. парны орган зроку = 25 _ 65 _ 40 _ 26 _;
4. форма дзеяслова, якая спалучае ў сабе прыметы дзеяслова і прыслоўя = 45 _ 46 _ 37 _ 28 _ 39 _ 18 _ 19 _ 13 _ 22 _ 23 _ 48 _ 68 _;
5. багністае топкае месца = 2 _ 4 _ 5 _ 3 _ 81 _ 80 _;
6. бог холаду язычніцкіх славян = 53 _ 38 _ 9 _ 47 _;
7. самка ката = 74 _ 73 _ 70 _ 14 _ 15 _;
8. афрыканскі кот з грывай = 36 _ 7 _ 8 _;
9. свінскі нос = 27 _ 50 _ 49 _;
10. яма для пахавання памерлых = 66 _ 41 _ 54 _ 44 _ 42 _ 43 _;
11. горад на Прыпяці з нафтаперапрацоўчым заводам = 6 _ 1 _ 79 _ 58 _ 77 _;
12. абазначэнне прадмета словам = 51 _ 52 _ 33 _ 34 _ 32 _;
13. марскія хвалі б'ючыя ў бераг = 67 _ 69 _ 71 _ 64 _ 78 _ 16 _;
14. дзяржава з Кампалай = 35 _ 63 _ 62 _ 61 _ 57 _ 56 _;
15. носьбіт душы = 29 _ 30 _ 31 _ 21 _;
16. крок = 59 _ 60 _ 20 _;
17. спакушальны райскі плод = 76 _ 75 _ 55 _ 82 _ 17 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 5 нумара

Ганіцель, бязмен, Ахен, Орша, атам, Дукса, урок, дзежка, падарожжа.

Рашэнне: **Ціхае мора не адукуе матроса.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

06.03 — 12.03

(22.03. — 20.04.) Ідэальны час афармляць справы, парабіць парадкі, дзякуючы кантактам можна знайсці цікавую працу, асабліва з 9.03. узмоцніцца твой арганізм. Адчуеш сябе адважным і рашучым.

(21.04. — 21.05.) 8-12.03. можаш разлічваць на шчаслівы выпадак. Цікавая прапанова заробку, падарунак ці мілая сустрэча. Да 8.03. асоба, здаецца, няшкодная, можа стаць сур'ёзнай пагрозай для тваіх пачуццяў. 6-10.03. — час разлікаў ды вызначання новых дарог; малодшыя Быкі могуць не раз пасварыцца з бацькамі.

(22.05. — 22.06.) 7-11.03. — поспехі на працы. Не чакай ідэальных умоў ці лепшых акалічнасцей — стварыі іх сам. З 11.03. будзеш няўступчывым, хітрым. Тваю паспяховасць ацэняць зайздроснікі, вядома, як. Можаш пазмагацца за пасаду сваіх мараў.

(23.06. — 23.07.) Пераканаешся, што блізкія для цябе — найважнейшыя. Зрабі крок у абраным напрамку, а рэшта пакоціцца сама. Зразумееш, што сапраўды важнае, выйдзеш на простую дарогу і пасмакуеш шчасця ў чыіхсьці абдымках. Не мрой, а пакуй багаж і едзь у падарожжа!

(24.07. — 23.08.) 8-12.03. партнёр дакажа табе, як яму на табе залежыць. Ды не аддавай сябе лішне іншым, не рабі нічога супраць сябе самога, бо пашкадуеш. Твае амбіцыі ідуць у пары з асабістай прывабнасцю. Аколяць цябе тлумы прыхільнікаў і аматараў.

(24.08. — 23.09.) 7-11.03. не раз ускрыкнеш „Эўрыка!". Будзеш мець наватарскія задумы і талент да вынаходстваў. З 11.03. (да 15.03.) жарснасць можа зацьміць табе розум (глядзі, з кім праводзіш позняя гадзіны!). Даўні канфлікт будзе цябе турбаваць, ды даруй правіны і закрый прыкры раздзел за сабою.

(24.09. — 23.10.) Будзеш больш кампанейскім, лёгка наладзіш новыя кантакты, будзеш гуляць і фліртаваць. Без праблем пераможаш розныя праблемы (няшмат), а тваім моцным бокам акажуцца спрыт, інтэлігентнасць і вынаходлівасць. З 11.03. (да 16.03.) магчымыя фінансавыя турботы; глядзі на рукі супрацоўнікам.

(24.10. — 22.11.) Адвага і рашучыя дзеянні; удасца лепш чым табе здаецца. Старайся парабіць як найбольш да паловы месяца. Сябры будуць блізка, а фартуна сыпане грашыма. Усюды ўбачыш добрыя бакі. З 11.03. (да 15.03.) магчымыя праблемы на працы, у кантактах з супрацоўнікамі, не рызыкуй крэдытаў.

(23.11. — 22.12.) 8-12.03. дзякуючы спрыту і добрым выпадкам маеш шанц шмат зарабіць. Такія нагоды і шанцы, якіх даўно ты чакаў! Шчасце будзе цябе спатыкаць на кожным кроку, хоць шмат будзе залежаць і ад людзей. Калі шукаеш працы ці хочаш павышэння, атрымаеш нават больш. Пачуццё свабоды і лёгкасці. Можа нечакана паявіцца новае каханне. 9.03. твая ініцыятыва і працавітасць сутрэнуцца з прыхільнасцю кіраўніцтва; хто шукае новай пасады, можа атрымаць шмат прапаноў. Можаш адкрыць невычэрпную крыніцу прыбытку!

(23.12. — 20.01.) Маеш у руках усе тузы, дык гуляй на найвышэйшую стаўку. Здабудзеш павагу ў тых, хто з табою не лічыўся. Калі змагаешся за любоў — адпусці, а здзівішся як гэта дзейнічае. Можаш пайсці на сваё.

(21.01. — 19.02.) Добры час у фінансавым і асабістым плане. Добрыя весткі. Пачнеш жыць на поўныя грудзі. Спадабаешся камусьці. Адважна рэалізуй свае мары. Адкрыйся на новы досвед з 12.03., на змены да лепшага.

(20.02. — 21.03.) Фантастычны настрой, зрэалізуеш свае планы і схочаш ступіць крок яшчэ далей (не кідайся яшчэ ў глыбокую ваду). Задумы на залаты інтарэс рэалізуй! Магічны час, калі можаш пазнаёміцца з кімсьці важным. У старых парах таксама рэвалюцыя. На фінансы глянеш рэальна; мабыць, прыйдзецца паашчаджаць.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Давайце самаперапішамся!!!

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Беластоцкія і падляшскія самаўрадаўцы і палітыкі, што выводзяцца з беларускага асяроддзя, з якімі ўдалося мне скантактавацца да выдання гэтага нумара „Нівы", не зусім аднагалосна ўпэўнены як пераканаць да гэтага, каб у час усеагульнага перапісу насельніцтва прызнацца да беларускай нацыянальнасці. Адны выказваюцца за спецыяльную інфармацыйную акцыю, іншыя ў гэтай справе больш памяркоўныя. Прыгадаем, што Польскі нацыянальны ўсеагульны перапіс насельніцтва і жылля будзе праводзіцца з 1 красавіка да 30 чэрвеня. Асобы, якія перадаюць даныя ў рамках перапісу, мусяць даваць дакладныя, вычарпальныя і згодныя з праўдай адказы. Выключна па прынцыпе добраахвотнасці можна збіраць ад фізічных асоб даныя датычныя: прабывання ў нефармальнай сувязі, веравызнання (канфесійнай прыналежнасці), а таксама ліку жывымі народжаных дзяцей ды пракрэацыйных планаў. У час апошняга перапісу (2002 г.) аказалася, што на Беласточчыне да беларускай нацыянальнасці прызналіся больш за 46 тысяч асоб, значыць, значна менш, чым паўсюдна меркавалася.

— Падставай таго тыпу выказванняў з'яўляецца досвед мінулага. Прынамсі ад пачатку пасляваеннага перыяду меркаванні на тэму ліку беларускай меншасці фармуляваліся на падставе ліку паслядоўнікаў праваслаўя, — тлумачыў вынікі перапісу з 2002 г. сацыяёлаг праф. Андрэй Садоўскі.

Навінкай сёлетняга перапісу будзе г.зв. самаперапіс — магчымасць перадачы даных праз камп'ютар, значыць, можна будзе перапісаць не толькі самога сябе, але таксама — пры іх згодзе — апошніх членаў сям'і ці знаёмых.

— Асноўнай справай з'яўляецца тое, што гэта не ўсеагульны перапіс, бо мае быць перапісана адна чвэрць грамадзян. Вельмі важнай з'яўляецца нацыянальная самаідэнтыфікацыя ў самаперапісе. Я маю намер сам перапісацца. Варта пачаць акцыю ў святле тэлекамер, мабыць, і з удзелам „Нівы", каб мы перапісаліся адважна, паказалі, што мы, беларусы, былі тут, ёсць і будзем, — гаварыў „Ніве" **Аляксандр Сасна, намеснік прэзідэнта горада Беластока, а заадно дарадчык прэзідэнта Браніслава Камароўскага па справах меншасцей.** — Нельга баяцца быць меншасцю пасярод большасці, хоць увесь час існуе клопат з цярпімасцю да меншасцей, іншасці.

Віцэ-старшыня Гарадской рады Беластока Славамір Назарук мае ідэю як пераканаць да таго, каб мы прызналіся ў час перапісу да сваёй нацыянальнасці:

— Трэба зрабіць акцыю лістовак. Такіх больш за дзесяць тысяч улётак маглі б быць распаўсюджаны нашымі прыходамі, брацтвамі ці згуртаваннямі, у час м.інш. нашых масавых мерапрымстваў. У змесце такой лістоўкі трэба зайграць на нашых нацыянальных пачуццях, — што мы адсюль, згэтуль родам, былі тут заўсёды. Мог бы ў ёй апынуцца фрагмент гімна: „Не забывай". Вядома, трэба дайсці да асоб вядомых у асяроддзі, якія хацелі б падпісацца пад такой лістоўкай. Я напэўна падпісаўся б пад ёю, бо адчуваю сябе беларусам.

Падобную думку мае **радны Падляшскага сеймікa Марк Масальскі**:

— Усё сядзяць у нас боязі з мінулага, звязаныя з прыналежнасцю да беларускай меншасці і яе горшым статусам, скажам, матэрыяльным. Напэўна патрэбна інфармацыйная акцыя, каб пераканаць тыя асобы, што адчуваюць сябе беларусамі — каб не адчувалі сябе няёмка. Такой акцыяй павінны заняцца беларускія арганізацыі, што дзейнічаюць у беларускім асяроддзі. Варта надрукаваць спецыяльныя лістоўкі і плакаты. Павінны мы ў іх заклікаць да яснага нацыянальнага вызначэння, без боязі. Пасля самаакрэслення беларусаў у канкрэтных мясцовасцях можна было б без перашкод карыстацца законам аб нацыянальных меншасцях, між іншым аб двухмоўных надпісах і ўжыванні ва ўстановах нацыянальнай мовы.

Беластоцкі радны Мікалай Мірановіч адзначае:

— Сваёй нацыянальнасці няма чаго саромецца, а гэтым трэба ганарыцца. Самавызначэнне залежыць толькі ад свядомасці саміх людзей. Як гэта сказаў Янка Брыль: „Я беларус дакладна так як і мужчына". У цяперашні час быць праваслаўным — беларусам, украінцам, расіянінам не з'яўляецца сакрэтам і сорамам.

Падляшскі радны Ян Сычэўскі (БГКТ, ТБК):

— Мы жывем у дэмакратычнай сістэме, у дэмакратычнай дзяржаве. І калі верым, што жывем у дэмакратыі, кожны чалавек павінен прызнавацца да сваёй тоеснасці.

Нацыянальнай тоеснасці не выбіраюць, яна нам даецца. Спекуляваць ёю было б неадпаведным і вельмі немаральным. Ніякай пагрозы няма ў нашай дэмакратычнай краіне, каб мы мелі баяцца сваёй нацыянальнай прыналежнасці. Непрызнаванне да сваёй беларускасці гэта праява баязлівасці, можа, арыентацыі на нейкія менш ці больш ілюзорныя карысці. Трэба адкрываць нашых людзей на каштоўнасці беларускай культуры, мовы, абычаяў і абрадаў, адкрываць пачуццё нацыянальнай прыналежнасці. Перад перапісам патрэбная інфармацыйная акцыя, можа шляхам інтэнсіфікацыі дзеянняў СМІ і элімінацыі разнародных апасак, вынікаючых, напрыклад, з досведу папярэдніх пакаленняў. Аднак нейкая асаблівая акцыйнасць у гэтай справе не прынясе спадзяваных вынікаў. Спатрэбілася б, аднак, супольнае выступленне ўсіх беларускіх арганізацый і згуртаванняў, і была б гэта праява еднасці, з якой у нас нялёгка.

Анатоль Вап, дырэктар дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Маршалкоўскай управы:

— Нельга пярэчыць таму, кім з'яўляешся, калі ты — беларус. Каб адчуць сябе паўнапраўным грамадзянінам, кожны з нас павінен атаясамлівацца з уласнай культурнай спадчынай, і толькі такога чалавека іншыя будуць паважаць. Нейкага спецыяльнага спосабу, каб пераканаць людзей да таго, каб у час перапісу прызналіся да сваёй нацыянальнасці — няма. Кожны мусіць вырашыць гэта ва ўласным сумленні. Самавызначэнне сваёй нацыянальнай прыналежнасці павінна быць відавочным. Жывем у дэмакратычнай краіне і няма чаго тут баяцца. Вядома, тлумачальная акцыя аб неабходнасці нацыянальнага вызначэння ў час перапісу патрэбная і павінны за гэта ўзяцца арганізацыі беларускай меншасці. Таксама перапісчыкі павінны быць свядомымі важнасці гэтай праблемы.

Незалежны дэпутат Яраслаў Матвяюк (дэпутацкі клуб СЛД), член сеймавай камісіі ўнутраных спраў і адміністрацыі:

— Нацыянальнае самавызначэнне ў час перапісу павінна быць справай натуральнай. Не трэба нікому пры ім брацца за нейкія надзвычайныя дзеянні. Тыя, у каго ёсць нацыянальная свядомасць, пакажуць сваю беларускую прыналежнасць. Важная тут свабода вырашэння. Усе надзвычайныя акцыі — штучныя.

Падляшскі радны Валянцін Карыцкі (ПСЛ, сябра Управы падляшскага ваяводства):

— Акрэсленне ў перапісе сваёй нацыянальнасці мае пасля ўплыў на трактаванне ўсяе меншасці большасцю, між іншым у выглядзе датацый на культуру меншасці. Вядома, калі меншасць невялікая па ліку або калі аказваецца, што яе няма — дык няма праблемы. Галоўная прычына неабходнасці нацыянальнага вызначэння гэта сам факт, што ты з'яўляешся беларусам, членам беларускай грамадскасці. Думаю, што сёння, у эпоху электронных СМІ, нейкая акцыя лістовак прынясе няшмат карысці. Гаварыць аб такой неабходнасці трэба, напрыклад, у беларускамоўнай прэсе. Трэба ўсведамляць, што нацыянальнае самавызначэнне мае ўплыў на далейшае функцыянаванне беларускага асяроддзя.

(працяг будзе)

ISSN 0546-1960